Таццяна Каленік

# Бабуліны шпулькі





Таццяна Каленік

# Бабуліны шпулькі

## Цікавыя гісторыі для ўсёй сям'і

Мінск
"Друкарскі Дом "Вішнёўка"
2020

УДК 821.161.3
ББК 84(4Беи)
К171

**Каленік Т.Р.**

**К-171** Бабуліны шпулькі: апавяданні. – Мінск: Друкарскі дом “Вішнеўка”, 2020. - 86 с.

Натхнёная ўспамінамі аб школьных канікулах, ахопленых абдымкамі вясковай рамантыкі, аўтар распачала цыкл празаічных замалёвак для ўсёй сям’і. Яны склаліся, нібыта бабуліны шпулькі, у адзіны цягнічок, які выносіць чытача ў свет фантазій і прыгод.

Свае гісторыі аўтар прысвячае малой радзіме, непаўторнай песні лясоў і лугоў, гаючай сіле крыніц, людзям з добрымі вачыма і іх традыцыям. Яна спрабуе дастукацца да сэрца кожнага чытача, вярнуць яго да сябе, да сваіх сапраўдных Вытокаў... І гэта так важна сёння, калі губляецца сувязь чалавека з прыродай, з родам, з сапраўднымі, духоўнымі каштоўнасцямі.

**УДК 821.161.3**
**ББК 84(4Беи)**

**ISBN 978-985-90525-2-1**

© Каленік Т.Р.,2020
© Друкарскі дом “Вішнеўка”, 2020

**“Адкуль мы ўсе родам? – З дзяцінства...”**

*Менавіта, гэта, выказаная некім думка, прыйшла да мяне, калі я дачытала да канца “Бабуліны шпулькі” – казачныя гісторыі для ўсёй сям’і, напісаныя Таццянай Каленік. Нездарма ж кажуць, што “дарослы, які не страціў здольнасць да творчасці – гэта дзіця, якому ўдалося выжыць”. У наш прагматычны, тэхнакратычны век захаваць у сабе чысціню ўспрымання дзіцяці вельмі складана. Але неабходна, каб заставацца Чалавекам. Час ідзе, змяняюцца пакаленні, мяняюцца назвы рэчаў, паняцці... Але ж, самае галоўнае павінна застацца – агульначалавечыя каштоўнасці, якія закладзены ў аснову існуючага свету. Так, яны, можна сказаць, нікім не пісаныя, але закладваюцца ў кожнага з нас пры нараджэнні. Іх магчыма назваць адным словам – сумленне. Напэўна, яно і ёсць тая жывая сувязь кожнага са сваім сапраўдным пачаткам, гэта той падмурак, без якога чалавек, як дрэва без каранёў, загіне... Бо: “хто карані свае губляе, той будучыні не мае...” – гэта таксама закон, які працуе, не гледзячы на яго прызнанне, ці не прызнанне.*

*Так, напэўна, кожную з “Бабуліных шпулек” можна было б “раскласці на пазлы”, прааналізаваць з розных бакоў, але я не захацела рабіць гэтага, бо значнасць “шпулек” у тым, што яны даюць магчымасць чытачу адчуць, зразумець нешта больш каштоўнае... яны дазваляюць зазірнуць у сябе,*

*зверыць свой унутраны свет з чысцінёй дзіцячага ўспрымання аўтара, магчыма, убачыць там нейкія плямкі і асвятліць іх нязгасным святлом дзяцінства, свайго асабістага – таксама... І кожнаму аўтар дае магчымасць зрабіць гэта асабіста. Яна праз свае ўспаміны спрабуе дастукацца да сэрца кожнага чытача, вярнуць яго да сябе, да сваіх сапраўдных Вытокаў... І гэта так важна сёння, калі губляецца сувязь чалавека з прыродай, з родам, з сапраўднымі, духоўнымі каштоўнасцямі.*

*Упэўнена, што кожны, хто пачне чытаць "Бабуліны шпулькі", не зможа адарвацца ад іх, пакуль апошняя з іх не "шаргане па манарэйцы" яго ўспрымання. І, безумоўна, такі чытач абавязкова адчуе гучанне своеасаблівага ўнутранага камертона, з якім і адбудзецца гарманічная сунастройка яго штодзённых думак з высокім голасам душы.*

*Мяркую, што нават марознымі зімовымі вечарамі, калі за вокнамі будзе злавацца паўночны вецер, у хаце, у якой раскрыюць кніжку з "Бабулінымі шпулькамі", будзе ўтульна і цёпла...*

*Дзякуй Вам, Таццяна Рыгораўна, за Вашы святло, чысціню і цеплыню, і за цудоўную здольнасць дзяліцца імі з іншымі!*

***Святлана Быкава**, паэтэса,*
*Старшыня Мінскага абласнога аддзялення*
*ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі"*

# Дзівацтвы Закона Прыцягнення

*“Калі вы чагосці вельмі моцна жадаеце,*
*у гульню ўступае Закон Прыцягнення”*
**Эндру Карнэгі**

Сэрца нібыта захлынулася цішынёю: “Калісьці на месцы гэтага голага поля квітнела і гаманіла вёска, спявалі і рагаталі калодзежы, плялі карункі коміны”.

...Балюча. Раптоўны выбух у грудзях: “Помнік! Тут павінен быць помнік!”, здавалася, напалохаў сусвет, і Закон Прыцягнення пачаў сваю гульню.

“Помнік!..” – магутна білася ў скронях. Я не ведала, якім ён павінен быць, а, калі шчыра, то часцей адганяла ад сябе думку, што апанавала мяне. А тым часам загадкавае біццё пашыралася і мацнела. Не, гэта не пульс. Гэта шукала выйсце Слова маёй вёсачкі, куды я прыязджала да бабулі і дзядулі, як дадому.

Мудры Закон Прыцягнення ўклаў у мае пальцы пяро, і я пачала пісаць. Спачатку пісала для дачок і будучых унукаў. Як фамільную каштоўнасць імкнулася перадаць ім Слова продкаў. Потым яго падхапілі сяброўкі.

Плакалі і смяяліся калегі, аздабляючы ўспаміны жартаўлівымі гісторыямі з жыцця *сваіх* вёсачак. Так, незаўважна, "фамільная каштоўнасць" пераўтварылася ў "бясцэнны грааль", які кожны дарослы нёс да сваіх дзяцей і ўнукаў, да дзяцей і ўнукаў знаёмых, суседзяў...

"Не, не бывае "чужых" і "сваіх" дзяцей, не бывае "сваіх" і "чужых" вёсак..." – прыйшло аднойчы паразуменне, і на свет з'явіліся мае першыя, даволі небездакорныя, эсэ. Хацелася адступіцца. Ды дзе там! І тут спрацаваў Закон Прыцягнення. Ён падарыў мне новых сяброў. Кволыя радкі пачалі дужэць і налівацца, калі колеру ім надаў **Леанід Лук'янцаў** (загадчык аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ДУА "Гімназія-каледж мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка, член Беларускага саюза мастакоў). Беларускі паэт, пісьменнік і гісторык **Уладзімір Арлоў** загартаваў іх як сталь, і даў запавет: "Наперад!". Спавіла іх "паспяховай" стужачкай **Лідзія Давыдзенка** – сакратар Саюза пісьменнікаў Расіі, галоўны рэдактар мастацка-публіцыстычнага часопіса "Берега", член Саюза журналістаў Расіі. А **Святлана Быкава** (паэтэса, перакладчыца, старшыня Мінскага абласнога аддзялення ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі), як першая настаўніца, песціла іх і ўдасканальвала. Потым яны трымалі экзамен, і строгі **Мікола Шабовіч** (беларускі паэт, перакладчык, кандыдат філалагічных навук, дацэнт БДПУ імя М.Танка) абвясціў: "Так!".

Тут пашчыравала і рука **Таццяны Якаўлевіч** – члена Беларускага саюза журналістаў, галоўнага спецыяліста Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Так нараджалася гэта кніга – своеасаблівы помнік малой радзіме.

Бязмежна-шчырыя словы падзякі я адрасую ўсім, чыя эмацыйная і прафесійная падтрымка дапамагала мне працаваць над праектам! Усім, хто даў магчымасць жывому Слову продкаў рухацца ад пакалення да пакалення!

Да слёз шчымлівыя ілюстрацыі да апаведаў даслалі **дзеці Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці**. Менавіта да іх я звярнулася ў першую чаргу, бо ў вочы маіх маленькіх землякоў і сёння глядзяць Усакінскія лясы, якія хавалі некалі ад жахаў вайны мясцовых падлеткаў – нашых маці і бацькоў, бабуль і дзядуль.

Нізкі паклон вам, **бацькі і настаўнікі** юных творцаў, за дапамогу ў стварэнні мастацкіх вобразаў, за ваш непасрэдны ўдзел у праекце.

Выказваю вялікую падзяку кіраўніку ДУДА "Клічаўскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі" **Святлане Аляксандраўне Ткач**. Гэта яна данесла маю просьбу да навучэнцаў розных школ раёна і горада і аб'яднала ўсіх, хто пажадаў далучыцца да працы.

Вельмі кранула мая просьба-прапанова зрабіць праект разам з юнымі талентамі Клічаўшчыны загадчыка аддзела па адукацыі, спорце і турызме

Клічаўскага раённага выканаўчага камітэта **Аляксандра Мікалаевіча Мялешку**. Вялікі дзякуй Вам, шаноўны Аляксандр Мікалаевіч, за Вашу любоў да роднай старонкі, да яе гісторыі і людзей!

Вось якая сувязь пакаленняў адбылася праз гэты невялікі твор, праз простыя дзіцячыя малюнкі. Што гэта – празорлівы ход Закона Прыцягнення? Як тонка новае пакаленне адчула подых Бацькаўшчыны! Спадзяюся, што хлопчыкі і дзяўчынкі, якія ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы кнігі да выдання, з яшчэ большай адказнасцю пачнуць цікавіцца гісторыяй роднага краю.

Прыемна здзівіла і тое, што чуткі аб нараджэнні кнігі "Бабуліны шпулькі" выйшлі за межы Клічаўскага раёна. Да мяне звярнуліся школьнікі і студэнты з розных куткоў Беларусі з пажаданнем маляваць малую радзіму, якую не столькі бачылі, колькі адчувалі праз цеплыню сваіх родных. Яшчэ больш узрушыла, што расчуленыя бацькі пачалі арганізоўваць сямейныя экскурсіі да тых мясцін, дзе некалі дзяды сеялі зерне жыцця, дзе пад вокнамі ружавелі яблыкі, дзе дубы ды клёны ўсё яшчэ хаваюць таямніцу першага кахання.

Не была выключэннем і **Мілання Шчэцька** са Стаўбцоў. Калі яе бацькі даведаліся, у якім праекце жадае прыняць удзел іх дачка, то палічылі неабходным пазнаёміць яе з куточкам сваёй Бацькаўшчыны ў так званай "Зоне адчужэння".

З якім жа хваляваннем дзяўчынка ўзялася ствараць, напэўна, самую адказную частку кнігі – яе вокладку!

Сэрца б'ецца часцей ад думкі, які ж рэзананс выклікае дотык да патаемна-роднага. Не, не забытага, а закалыханага памяццю.

Хочацца адзначыць высокі прафесійны падыход супрацоўнікаў **ООО "Друкарскі Дом "Вішнёўка",** а таксама ўзгадаць імёны маіх дзяцей **Аксінні Каленік-Бенчэў, Хрыста Бенчава, Ганны Каленік**. Яны фінансавалі праект і паклапаціліся аб выхадзе кнігі да Дня майго юбілею.

Прыгожае выданне. Сапраўдны падарунак маёй малой радзіме, нашчадкам і кожнаму, хто трымае цяпер у сваіх руках кнігу "Бабуліны шпулькі".

*Таццяна Каленік*

# Бабуліны шпулькі

## Спадчына ад гаспадыні-Печы

### – 1 –

Так здарылася і ў гэты сонечна-ціхі дзень: звесіўшы ножкі з падаконніка, ветрык углядаўся ўдалячынь. Недзе ля ракі спявала дзедава каса, а тут, у хаце старая маслабойка спрачалася з бабулінай руплівасцю. Ветрык без толку ганяў разнасцежаныя створкі акна, у якіх адлюстроўваліся пухнатыя аблокі ды жытні ўзгорак, перахоплены шнурыкам палявой дарогі.

– Та-а-ак, будзе з кім пагарэзіць! – радасна ўсхадзіўся ён, як толькі ў полі свайго зроку злавіў жывую кропачку на хвалях маладога калосся. Кропачка паступова набліжалася, павялічвалася, і ўжо праз некаторы час у ёй пачала пазнавацца постаць знаёмай дзяўчынкі.

Бабуля адразу здагадалася, пра каго “ідзе гаворка”! Яна схапіла святочную хустку і пашыбавала насустрач.

### – 2 –

Дзверы прыгараднага пазіка зачыніліся за Áлінай спінай. Наперадзе ж – бязмежнасць, ахопленая ледзь улоўнай рысачкаю далягляда. Гарачымі пясчынкамі пачала храбусцець дарога і, здавалася, няма ёй ні канца,



ні краю. Радаснымі пералівамі вітаюць жаўрукі. Вітаюць, хоць і моўчкі, кузурачкі ды жучкі: усё нешта пішуць, пішуць па рыжавата-белым пяску... Якая непаўторная вязь! Аб чым яна?.. А вось і каласы схіліліся ў самыя ногі, таксама вітаюць. Дзяўчынка ўсё гэта прыкмячала і кожнаму імкнулася адказаць узаемна-ветліва. Яна нават не заўважыла, як дарога вынырнула з жытнёва-аксамітнага мора ў прыбярэжную лагчыну, дзе адпусціла ў бок ад сябе ледзь бачную сцяжынку.

Прахалода крыху прыкамечанай травы спалохала разутыя ножкі, і яны пабеглі... Пабеглі спачатку нясмела, потым хутчэй і хутчэй. Дабеглі да кладачкі, якая пацешна пагушкала над ракою-мяжою... да таго берага, які пакідаў за плячыма гэты, а ад яго так не цярпелася збегчы... да танюткіх былінак, абуджаных спевам вясёлай хады, у якія хацелася нырнуць і плысці, плысці, гартаючы аблокі марамі... Ды за кожным рухам дзяўчынкі ўжо сачыла бабуля. Яна прагнула быць першай, хто стрэне тут сваю крывіначку. А Аля ўжо ні ішла, ні бегла – яна ляцела разам з мятлікамі і стракозамі насустрач родным, сябрам і вясковым прыгодам!

Жанчына стаяла ў задуменні. Яна спынілася напрыканцы агарода, дзе гушчар пявучага аерніку хаваў крынічныя ночвы. Парэпаныя цяжкай працай пальчыкі сціскалі ражкі хусцінкі – бабуля ў хваляванні так і забылася ўпрыгожыць ёю бялюткія валасы. На іх спыніўся просценькі грабеньчык.



Здавалася, ён наўмысна ўтрымлівае кожны валасок, каб бачылі ўсе, як жвавыя сонейкі, якія адбіліся ад паверхні крынічнага люстра, лашчаць добрыя зморшчынкі бабулінага твару. Яна заўсёды сустракала тут дарагіх гасцей, каб здарожаны і смагу мог наталіць, і перад роднай зямелькай укленчыць. А яшчэ, па яе словах, хто гэтай чароўнай вадою пачастуецца, той адразу стане здаровым і моцным.

– А няўжо я хворая?! – здзівілася Аля.

– Не. Хіба, што... кволая. Вы ў горадзе ўсе такія, – прагучаў сухавата голас жанчыны. У ім утойвалася пагарда да горада-хапуна, а яго было за што не любіць. Ён зманьваў моладзь, абяцаў забавы ды лёгкае жыццё з выгодамі ў кватэрах, а сам... Сам усё мацней і мацней дыхаў на плямачкі маленькіх паселішчаў знішчальным подыхам.

## – 3 –

Алечка... Аля... Альжбэта... – так звалі нашу гераіню сябры і дарослыя, а аднакласнікі калі-нікалі ды пажартуюць: “Альфа! Бэта!”

Паздаравелая і ўздужалая на кубачак крынічнай вады, Аля спынілася ў сярэдзіне хаты і, ахопленая суладдзем наваскаванай столі, нефарбаванай падлогі і лёгкага подыху сцен, пачала ўлівацца ў яго гармонію. Хацелася дыхаць разам з імі і не скідаць з плячэй абдымкі прыемнай прахалоды.

Яны агарнулі яшчэ з парога, а потым да іх далучыўся ментолавы водар дзікай мяты, які заляцеў у пакой праз акно, быццам нехта ўнёс яго ў жмені проста пад нос дзяўчынцы.

– Хто тут? – агледзелася тая. Ужо вельмі адчувалася прысутнасць яшчэ кагосьці, хто паспеў нырнуць за аконны праём.

Ніхто не адгукнуўся... Толькі стоены подых жартаўліва пранізваў цішыню. У адказ на гэта Аля напоўніла бутэльку з дзіравым коркам вадой, стрымліваючы прадчуванне, падкралася да акна, ды я-я-як пырскане туды, за фіранкі!

– О-ёй! – пачуўся смяшлівы пярэпалах з таго боку. – Ты намачыла маю крылатку! Як жа мне цяпер палохаць усіх?!

– Дык ты мяне пужаць надумаўся... І як гэта ў цябе атрымліваецца? – развяла рукамі Аля. – Слухай, а навучы мяне!

...Ды толькі на гэты раз яна атрымала водар каровінай наплёхі, так і не ўбачыўшы таго, хто так няўдала пажартаваў з яе.

– Ты – дрэнны! – скрывіла вусны дзяўчынка і ўжо падрыхтавалася раўці. Нехта нябачны пагладзіў бліскучыя крэндзелі яе косак, цёплым подзьмухам змахнуў слязінкі і зарагатаў:

– Не, я не дрэнны, я проста – вясёлы! Няўжо не пазнала? Я – сябар твой, ветрык, які жыве за аконнай ліштвою... Узгадай, як я настрашыў цябе

залетась, калі ваўком каля хаты выў... А летась мы з табой у хованкі гулялі, памятаеш? Давай ізноў гуляць, я так па табе сумаваў!

– Вось чмут, – засмяялася Алечка скрозь усхліпы, – як жа мне шукаць цябе, ты – нябачны?

– А папросту... Бачыш, дзедавы медалі на пільчаку[1] варухнуліся? Гэта я плечы разгарнуў. Цяпер сюды, на паліцу, зірні! Тут – вяршкі лізнуў, таму сурвэтка на гладышу захісталася. Я заўсёды там, дзе рэчы варушацца. А цяпер адгадай: дзе я?

Пакой затаіў дыханне... Разам з ім замерла і дзяўчынка... Да шыі нехта дураслівa дакрануўся, падалося – пёркам, ледзь-ледзь... Толькі Аля прыгатавалася пляснуць па ім далонню, як вясёлы дураслівец апынуўся на яе носе! А вось – ужо на крайку вуха сакоча... З вуха – на ложак перамахнуў, з ложка – пад услон... Так і пайшло ўсё ходарам: Аля – за сябрам, сябар – за куфрам; Аля – за куфар, ветрык – за дываны! Падушкі ў паветры складаныя сальта вінцяць, старая шафа адбівае стэп крывымі нагамі, а з цвікоў пасаскоквалі партрэцікі і забегалі, закружыліся па сценах, аж стол заматляў спадніцаю! Адна толькі печка, як стаяла надзьмутая, так і стаіць, з месца не зварухнулася, быццам яе нічога не тычыцца, быццам яна тут самая важная, і на яе магутных плячах трымаецца ўсё. Ну і няхай

---

1 Пінжак

сабе стаіць, а сябры, як дурэлі, так і дурэюць! Яе проста завідкі бяруць – занадта пузатая!..

У дзвярным праёме з'явілася бабуля. Ёй не цярпелася ведаць, хто гэта так хату пераварочвае.

– А-а-а, з табой сябры? Ну, гуляйце... – і яна зноў знікла за палавінкамі дзвярэй.

Аля стаяла пасярод пакоя і не разумела – якіх сяброў убачыла бабуля, калі ўсё пазастывала ў прадчуванні, што бабуля насварыцца?

Яшчэ не супакоілася сэрца ад шалёнага тахкання, яшчэ не паспела яна ўцягнуць паветра на поўныя грудзі, як бакавы зрок злавіў квятчастае хваляванне.

– Гэта я... – таемна шаптаў ветрык з-за стракатай шырмы, якая захінала ложак ад чужых вачэй. – Ну як, хораша я схаваўся... ад бабулі?..

І шафа схапілася за жывот. За ёю – стол, партрэцікі з дыванамі, Аля... Несупынны смех рваў бакі, хапіла толькі ўявіць: нябачная істота тоіцца ў хвалях тканіны, нешта ціхенька шэпча, каб ніхто яе не чуў, яшчэ і жартаваць прымудраецца... Ды як жа без шырмы – прыкметнай і какетлівай фігуранткі пакою? На правах галоўнай гераіні, яна тэатральна шчоўкнула шпулькамі, каб перавесці ўвагу на сябе...

## – 4 –

Пустыя драўляныя шпулькі, на якія бабуля прыдумала чапляць шырму, заўсёды прыгожа лопалі, калі даганялі адна другую. Яны коўзаліся па нацягнутай пад столлю струне і вельмі нагадвалі манарэйкавы цягнічок. Сябры падарожнічалі на ім ў свет казачных прыгод. Кожная шпулька – адпаведны вагон, са сваім імем і колерам: колер пунсовай гісторыі, напрыклад, ці колер Язэпавай маляванкі... А вось тая, у сярэдзіне, на якой некалі былі накручаныя жоўтыя ніткі, мае колер цытрынавых цукерак...

Усе ганялі шырму туды-сюды, а з ёю і катушачны лакаматыў не прыпыняў рознакаляровыя апавяданні. Штодзень вясёлая сябрына займала месцы ва ўтульных купэ і цешылася незвычайным падарожжам...

Але ж – як кожнаму лакаматыву надыходзіць час павярнуць на запасную калейку, так і канікулы некалі канчаюцца. Аля бегла насустрач бацькам, школе, падручнікам... Аб тым, што бяжыць насустрач будучыні, яшчэ не ведала.

## – 5 –

Колькі часу прайшло? – не падлічыць... Альжбэта прыехала зноў, ды ўжо не адна, з дачушкай. Маленькія сандалікі весела адбівалі залацістыя пясчынкі вясковай дарогі, спяшаліся да казачнага цягнічка...


Школа

## – 6 –

Нібы стомлены ветразь, які забыўся ў моры здзічэлых траў, які зацята супраціўляецца бегу дажджоў і аблокаў, пазірала з пустэчы знямелага дворышча печ, быццам нічога яе не тычыцца, быццам яна тут самая важная, быццам усё яшчэ нешта трымае на прыгнутых ужо плячах.

"Не! – адмаўлялася сэрца верыць убачанаму. – А можа, усмяглыя аладкі чакаюць?.. Ці на крайку яешню бабуля пакінула, як заўсёды клапатліва пакідала, калі некуды сыходзіла?.. Не! Гэта толькі дрэнны сон!.. Прывід!.." Павекі моцна сціснуліся, у вушах зашумела, а ў галаве закруціліся падзеі, людзі, час. Жанчына бегла да пашарэлай постаці, адзінай, што ўсё яшчэ чакае, і папракала сябе не толькі ў здрадзе, а і за тое, што некалі так легкадумна кпіла над ёю!

Неўзабаве пачуўся грукат, падалося, – з чэрава печы... Так! Знутры цаглянай гаспадыні нехта меладычна стукаў па засланцы. Сэрца пачало павольны адлік крокаў...

...Слёзы засцілі вочы – на стылым подзе, падціснуўшы ножкі, сядзеў усё той жа маленькі гарэза-ветрык – ад непагадзі хаваўся, сяброўку пільнаваў.

– О, а я ўжо думаў – не дачакаюся! – узрадваўся знаёмы галасок, ледзь стрымліваючы маркоту. – Ну як, хораша я схаваўся... ад печкі?

Дасціпны сябар зноў знайшоў прыгожы жарт і, як некалі, пяшчотным павевам змахнуў слязінкі з Аліных шчочак.

– Кажуць, калі хочаш нешта надзейна схаваць, схавай тое на самым бачным месцы, вось я і затаіўся пад печчыным носам... І манарэйка тут, са мною. На вось, казкі нашы напішаш! – і нябачныя ручкі працягнулі Альжбэце бабуліны шпулькі.




# Шпулька першая
## "А"

### – 1 –

Першая шпулька заўсёды прысвячалася сябрам. Сябры дзялілі не толькі кубак сырадою, а яшчэ: бясклапотнае летняе надвор'е, бадзёрыя хвалі ракі, на якіх пагушкваліся аж да ча́кання зубамі і ніколі не хварэлі, смяшлівы пясок, які казытаў басыя ступачкі, а таксама шчымлівыя радкі папулярных песень.

*"Чтоб дружбу товарищ пронёс по волнам,*

*Мы хлеба горбушку – и ту пополам!.."*[2] – запявала заўсёды вясёлая Света, захопліваючы ўсіх яскравым пазітывам. Кожны склад гэтых радкоў вымаўляўся з

2 песня кампазітара А.Іванова на вершы А.Пракоф'ева "Товарищ".

асабістым пачуццём, як гімн. Разам з ім дзеці адпраўлялі ўвышыню мары, надзеі і найлепшы пасыл сябру, і верылі: тое, што не даляцела – данясуць аблокі.

Света... Лена... Шура... Дзятва ніколі не звярталася адно да аднаго памяншальна – бралі прыклад з дарослых. "Ваняк" ды "Маняк" – не існавала. Дарослыя ставіліся да такіх жа сыноў зямлі, як і самі (ці то да старэйшых, ці то да малечы), з вялікай павагаю, таму іх вочы, душа і вусны выдавалі шаноўнае: "Міхаіл"... "Вольга"... "Хведар"...[3]

## – 2 –

– А́ртур. – упэўнена прамовіў белабрысы хлопчык, які прыехаў да родных з Курыльскіх выспаў і падаў руку для знаёмства.

– Какой же ты "А́ртур"? Ты – Арту́р! Носишь рыцарское имя,

---

3 У шасцідзесятыя - васьмідзесятыя гады мінулага стагоддзя людзі сталага веку яшчэ памяталі традыцыю сваіх продкаў і звалі чалавека, са слоў мясцовых жыхароў, адпаведна яго ўзросту і статусу. З прыходам хрысціянства прыйшлі і хрысціянскія імёны. Аднак памяншальна-ласкальная форма імя, такая, як "Ванька", не замацавалася ў асяроддзі тутэйшага насельніцтва. Людзі пачалі выкарыстоўваць новыя імёны, але імкнуліся адпавядаць традыцыям сваіх прашчураў: рос чалавек – расло і імя. Дзявочыя ж імёны: "Манька", "Волька" дапускаліся, але да падобнай формы імя ставіліся з асаблівай асцярожнасцю.

а правильно поставить ударение – не потрудился![4] – раптам залямантавала дзяўчынка на рускай мове, каб выглядаць у вачах новага знаёмага больш сучаснай.

Хлопчык збянтэжыўся. Было добра бачна, як запаліліся чырванню яшчэ не загарэлыя шчокі, а позірк слізгануў да долу.

– А́ртур! – паўтарыў ён больш настойліва, але зусім не пакрыўдзіўся, бо яго вочы заўсёды свяціліся прыязнасцю і дабрынёй. Напэўна хлопчык сумаваў па роднай мове на чужыне, таму прытрымліваўся не толькі мясцовага дыялекту, а яшчэ і нейкай асаблівай гаворкі сваёй бабулі Жазэфіны. Яна размаўляла па-беларуску, але з лёгкім налётам польскага акцэнту, што выдавала яе заходне-беларускае паходжанне. Якраз у беларускіх каталікоў імя "Артур" і прамаўлялася з націскам на літару "А", ды толькі дзеці гэтага яшчэ не разумелі. Хлопчык ведаў, што вымаўляе сваё імя правільна, а растлумачыць – чаму, не мог.

– О, "Эврика!" – падхапіла сяброўка словамі Архімеда – Теперь я знаю, как будет называться первый вагон моего катушечного поезда![5]

Аля распавяла новаму сябру пра выдуманы цягнічок і на борце

4 – Які ж ты "А́ртур"? Ты - Арту́р! Носіш рыцарскае імя, а правільна паставіць націск - не палічыў патрэбным!

5 - О, "Эўрыка!" - падхапіла словамі Архімеда дзяўчынка. - Цяпер я ведаю, як будзе называцца першы вагон майго шпулькавага цягнічка!

першай шпульці, якую прысвяціла сябрам, старанна вывела загалоўную літару яго імя.

“А” – ёсць “Азъ”... “Альфа”... – пачатак... і якая, па сутнасці, розніца, на які склад падае націск. На здзіўленне, А́ртур-Арту́р стаў пасля самым лепшым сааўтарам яе вясковых гісторый. Ён, як і яго сяброўка, складаў вершы (праўда, лепшыя!), бачыў у людзях толькі добрае, радаваўся захаду і ўсходу сонца!.. У іх нават любімцы былі адзіныя: Вячаслаў Харламаў – харызматычны хакеіст; “цуд з коскамі” Вольга Корбут, і, як ні дзіўна, паэт Максім Танк. Дзяўчынку ўражвала, што хлопчык жыве ў Сібіры, а размаўляе і цытуе вершы на беларускай мове... Хлопчыка ж здзіўляла прыхільнасць гэтай дзяўчынкі, а таксама мясцовых падлеткаў увогуле, да мовы, на якой ніколі не размаўлялі іх матулі, быццам саромеліся яе.

## – 3 –

Дзеці і музыку складалі... па ластаўках! Птушкі садзіліся на драты электрычных слупоў, як ноткі на нотным стане. Алю цешыла, што гэтыя дзівосы бачыць не толькі яна. Прыемна было і тое, што яе блізня па духу вельмі ўважлівы да даўніны. Завядуць, бывала, вяскоўцы шаноўнага веку старадаўнія песні на бяседах – моладзь ад іх і адасобіцца, свае кружэлкі слухае альбо пад гітару спявае. Іншыя хлопчыкі і дзяўчынкі

таксама ўцякалі туды, адкуль чуліся сучасныя шлягеры, а Артур жа – не, не сыходзіў, слухаў спевы старэйшых разам з Аляю.

..."Няхай конь мой, ой напасе-э-цца, дзеўка красна, хай нагуляецца-а-э-эй..." – шматгалосна зацягвалі яны, убіраючы ў сябе кожны паўтон гэтага, яшчэ жывога цуда, які ўпэўнена выціскала з чалавечага жыцця сучасная эстрада. Мурашкі сыпаліся па скуры, калі гэтыя людзі, без усялякіх рэпетыцый раптам падзяляліся на сапрана і альты, і вялі, кожны сваю меладычную лінію, па-асабліваму розна, але ўзнёсла і зладжана з іншымі!

А яшчэ Артур і Аля любілі маляваць... Мальбертаў у іх не было. Іншы раз і фарбы хутка канчаліся, а аўтакрама доўга не прыязджала, бо зноў дажджамі размывала дарогі. Гэтую цяжкасць сябры вырашалі проста – малявалі на мальберце нябёсаў! Самымі яскравымі малюнкамі былі кветкі, якія летуценнікі дарылі адзін аднаму. Часам паміж загагулінамі фантазій раптам маляваўся свежы хлеб... (так, і ён у марах прысутнічаў, бо вельмі часта прыходзілася есці чэрствы), а праз некаторы час іх клікалі бабулі. Сябры ўжо ведалі – хутка іх адправяць па хлеб у вялікую краму цэнтральнай сядзібы калгаса, куды хоць як, а тавар дастаўлялі.

Дзіўна, але ім было зусім не цяжка пераадолець трохкіламетровы шлях у краму, адстаяць у ёй нудную, пакручастую чаргу, хвост якой губляўся далёка за дзвярыма, потым набрацца моцы на зваротны шлях з сеткамі,

якія пераціскалі далоні не дзіцячай вагой... Па-першае, здзейснялася намаляваная мара, па-другое, падтрымлівала плячо сябра! Нягледзячы на тое, што кожны цягнуў па поўнай авосьцы хлеба, яны адломлівалі ад румянай скарынкі па кавалачку і частавалі адно аднаго. Гэта дзіўным чынам натхняла, а ногі адрываліся ад зямлі разам з грузам, і сам сабою ўзгадваўся ўрывачак любімага шлягера:

*"...Коль ветер лавиной, и песня лавиной, -*
*Тебе половина, и мне половина-а..."*

Іншы раз здавалася, што дзяўчынку і хлапчука зляпілі з аднаго цеста, – такімі падобнымі яны былі душой і думкамі. Адно толькі раз'ядноўвала – націск: "А́ртур!" – настойваў хлопчык; "Арту́р!" – спрачалася Аля! А калі шчыра, то ёй падабалася такая форма імя – мяккая, незвычайная. Аднак саступіць не магла, бо на сто адсоткаў была ўпэўненая, што ў гэтым пытанні мае рацыю яна.

## – 4 –

Тая спрэчка доўжылася і доўжылася: дзень у дзень, год у год. Але спынілася ў адно імгненне.

Чарговыя канікулы толькі пачыналіся. Каласы наліваліся малочна-васковай пяшчотай і шчымліва перашэптваліся з ціхімі вятрамі. Нічога не прадвяшчала перамен.

Хлопчык прыбег перапалоханы:

– Я... я толькі на хвіліначку, сказаць: "Да... да пабачэння"!

Растлумачыць, што здарылася, у яго не хапала моцы. Дзыўчынка чакала ўсяго, але толькі не таго, што пачула потым:

– Мы... тэрмінова ад'язджаем... назаўсёды!.. Бацьку накіравалі ў іншы горад, у іншую краіну...

А́ртур-Арту́р яшчэ не ведаў, куды яны паедуць, але па ўсяму было відаць, што для яго, як і для дзяўчынкі, расстанне з сябрам – як пазбаўленне крылаў:

– Не, ты так не думай, мы не страцілі крылы, наадварот, яны мацнеюць! Мы будзем далятаць да аблокаў і дасылаць з імі адно аднаму лісты! Сняжынкамі ці дажджом, вясёлкавай фарбай ці водарам духмянага хлеба яны знойдуць кожнага з нас... Так-так, ты не памылілася – кожнага... Так не будзе заўсёды, павер, хутка ўсе сябры разляцяцца, як птушкі, кожны ў свой вырай.

– Странный ты! – крывіліся вусны ад крыўды. – Куда, по каким адресам доставлять облакам письма? Взять тебя, к примеру: "улетаешь", а названия города, который тебя пропишет, не знаешь!..[6]

6 - Дзіўны ты! - крывіліся вусны ад крыўды. - Куды, па якіх адрасах дастаўляць аблокам лісты? Узяць, да прыкладу, цябе: "ляціш", а назвы горада, які цябе прапіша, не ведаеш!..

– Нічога, гэтыя "паштары" высо-о-ока плывуць, убачаць – куды... – не сунімаўся хлапец, і сябры перавялі позірк на шматабяцальныя аблокі...

## – 5 –

"Вітаю з Бабруйска! Алена." – выводзіць белая крэйда па ультрамарыне нябёсаў...

"Народилася внучка Софійка!"[7] – бяжыць і растае радок з Кіева, ад Святланы.

"...сағыну..."[8] – толькі і паспявае дацягнуцца з Караганды. А сярод літар і шматкроп'яў квітнеюць аўтарскія красачкі ад сябра, які не падпісаў сваё палатно.

---

7 З украінскай мовы: "Нарадзілася ўнучка Софачка!"

8 З казахскай мовы: скучаю.

# Шпулька другая

## Бабуліны зорачкі

### – 1 –

Не-е-е, столькі зорак, як было раней, у час высокіх тэхналогій чамусьці няма, а памятаецца... Памятаецца: выйдзеш некалі з хаты, а зорак у нябеснай сінечы – аж дух займае! Быццам сыпанула, не шкадуючы, шчодрая рука! Волаты, малечы, гарэзы – ззяюць, мігцяць, нібы смяюцца! Нібы даўно ў двары чакаюць, з хаты выклікаюць, а сустрэўшы знаёмыя вочы, узрадуюцца, як дзеці тыя – шчыра і непадробна!

Сядзеш на ганку, прытулішся плячыма да драўлянай сцяны і адчуеш, як аддае яна апошняе цяпло, назапашанае за дзень. Абласканая дзённым свяцілам, яна і сама шукае, каго б суцешыць. Лёгка так стане – стома, бы вада, збягае. Разамлееш, галаву ўгору закінеш, зоркі пачынаеш лічыць! Яны – як сябры недасягальныя, але заўсёды адданыя, загадкавыя. Гукнеш каторую на імя – голас паштовай птушкай ўсё вышэй і вышэй касмічную тоўшчу пранізвае. Праз некаторы час зорачка і адгукнецца: яскрава міргане, нават павернецца – сукенку з другога боку пакажа, какетка, ды зноўку бруіцца несупынным святлом у бязмежны сусвет.

Калі надумаешся на вышках заначаваць – да світанку не заснеш. Кінешся ў абдымкі духмянага сена – і паляціш у зорную далеч, ловячы шэпт з вышыні! А цішыня – слых не наталіць!.. Нават сабакі не брэшуць. Можа, і яны, высунуўшы сонныя пысы з будак, лунаюць у квецені зорных садоў? Ні мыш не прашмыгне, ні павучок у кутку незашклёнага акенца не варухнецца. І толькі першы певень нехаця і нясмела парушыць гэтую цішыню, абвясціўшы аб завяршэнні маленькага праменаду, аб сканчэнні кароткага спаткання.

Сягоння ж... бяжыш са школы ці з працы, уткнуўшы позірк у квадратныя ілбы тралейбусаў, якія маршыруюць і маршыруюць, як на пляцы – патрэбны чакаеш. Забярэшся ў яго абмежаваную прастору, утаропіш вочы ў прастакутнік-тэлефон, калі-нікалі кінуўшы позірк за акно, і назіраеш за штучным цягам жыцця і жыццём вуліц, апраўленых квадратамі дамоў... У замкнёнай кабінцы ліфта ўзляціш у манатоннасць чарговай канфігурацыі ў чацвёрцы кутоў, глухіх і сумных, і... Калі і з'явіцца хвілінка на неба зірнуць – толькі і ўбачыш: плыве самотнік-месяц ды дзе-нідзе, перамагаючы настырны націск урбанізацыі, зіготкі яго суправаджаюць.

А калісьці... Выскачыш з цёплай хаты ў крамяны восеньскі ранак, ахопіш поглядам і душой адкрытыя далягляды, удыхнеш іх свабоду на поўныя грудзі, ды і здзівішся: на шурпатых далонях ссівелых дахаў красуюцца аранжавымі чэравамі цяжарныя гарбузы... Як яны туды трапілі?!



Бабуля смяялася: “То знічкі з неба зляцелі”.

Памяць хуценька ўзнаўляе карціну жнівеньскіх вечароў: лёгкія ветрыкі кранаюць скуру, зачароўваючы аксамітам апошняга летняга подыху. А зоркі, зоркі-маладухі, так і адрываюцца ад баклажанава-чорнага палатна нябёсаў і велічна імчацца ў новы віток жыцця, пакідаючы пасля сябе вокамгненную рысачку бязважкага вэлюму. Крыху сумнае шэсце, але якое ўрачыстае, якое шматабяцальнае!..

## – 2 –

– Хутка мы прымем у іх роды, – спыняў хаду ўспамінаў голас бабулі, – тады зноў на небе з’явіцца шмат-шмат маладзенькіх бліскучак – новых табе сяброўак-зорачак, а пакуль... Няхай крышачку паляжаць, час яшчэ не надышоў.

Час, час, час, – адгукалася рэхам сэрца кожнаму кроку, а дзень за днём цягнуліся невыносна доўга. Як жа карцела хутчэй убачыць народзіны зорных немаўлят і адчуць іх подых не дзесьці высока ў небе, а тут, на зямлі, зусім побач! Дакрануцца да іх, нават у руках патрымаць! Хіба такое магчыма? Можа, таму праз кожныя паўгадзіны з вуснаў маленькай Алечкі так і зрывалася: “Скажыце, а часу яшчэ не было? Нагадайце, калі ласка, калі ён прыйдзе”...

"...Час", – урэшце рэшт даляцеў да яе вушэй абрывачак фразы з нягучнай размовы кабет, якія сустрэліся ля калодзежа. Аб чым ішла гаворка Аля дакладна не чула, ды ёй тое і не трэба было, яе клапаціла толькі адно слоўца...

За штодзённай працай бабуля даўно забылася пра тую размову з унучкай і нават уцяміць сабе не магла, чаму тая так часта задае адно і тое ж пытанне, і які сэнс для яе мае гэтае загадкавае слова.

– Ура-а-а! – узрушылася Алячка. – Час! Час надыйшоў!

Жанчына павольна выпрасталася, абхапіўшы паясніцу стомленымі пальцамі... Заправіла белую пасму валасоў, якая выбілася з цеснага палону хусткі, хітра ўхмыльнулася і неўзабаве прамовіла:

– Ну, час – дык час.

Сэрца малой затрымцела! Панеслася! А бабуля... не ў такт ураўнаважана, не ў такт мерна накіравалася пад страху нізенькай лазенкі.

Гаспадыня зняла з даху самы спелы, жоўта-чырвоны з зялёным пражылкам гарбуз і паклала яго ў доўгія начоўкі, якія мелі духмяны водар драўніны (іх дзед выразаў са ствала вялізнага дрэва). Вельмі беражліва, аж дыханне перахапіла, разрэзала пухнатае чэраўца, і...

О-о-о, колькі іх?! Немаўляткі-гарбузікі! Немаўляткі-зорачкі! Цэлая арцель! Цэлая процьма! Бабуля ласкава ўсміхнулася і ўрачыста ўклала ў маленькую далоньку ўнучкі некалькі коўзкіх зярнятак:

– Ну, прымай нованароджаных!



## – 3 –

І сапраўды, чым больш цяжарных гарбузоў трапляла ў дзервяныя ночвы, тым багацей і багацей ураджайныя грады нябёсаў засяваліся выразнымі, крамянымі заранкамі!

Дык куды яны цяпер падзеліся? Дзе тая шчодрая рука, што багата сее?

Стаіць Альжбэта нязрушна, шукае вачыма нешта... а што? Голас родны намагаецца злавіць, а наўкруг – цішыня нязвыклая.

Азірнулася... Бабулі не стала...

Бабы Зосі – бабулі яе сяброўкі Анджэлы, таксама даўно няма...

На мінулым тыдні Хадосіха рукі склала... Апошнім часам у горадзе была, сын забраў. Адчуць бы жывы водар начовак...Няма. Ды і навошта яны, калі не трапляюць ужо гарбузы на дахі?

Дахі... Дахі... Дахі...

Дзе вы, шурпатыя далоні вёсачак нашых?..

# Шпулька трэцяя
## Цытрынавы гарошак

### – 1 –

Як ні завітаеш да бабулі – у шафе цукеркі ляжаць, вабяць... Яркія фанцікі самі ў рукі просяцца, ды пакуль не атрымаеш гасцінец ад дарослага, толькі і застаецца – слінкі глытаць. Больш за ўсё прыцягваў увагу цытрынавы гарошак, абсыпаны цукрам. І што ў тым цукру такога? Звычайныя салодкія крышталікі, але ж на аксаміце жоўтых круглячкоў яны зіхацелі сонечнымі бліскавіцамі і гулялі адценнямі напаўпразрыстай глыбіні, а яна кружыла галаву так, што ў тую таямніцу хацелася нырнуць.

Бабуля не спяшалася адзначыць прыбыццё ўнучкі салодкім пачастункам. Яна казала, што любой ўзнагароды трэба быць годнай. Ёй, напрыклад, цукеркі на палічку вуж-мудрэц прыносіць, а падарункі дарыць – неззвычаена.

### – 2 –

Загадкавага вужа Аля дагэтуль не сустракала. "О-о-о, – тлумачыла бабуля, – гэты разумнік не кожнаму на вочы трапляецца. Яго ўбачыць – ужо ўзнагарода... Ён умее адзначыць добрыя ўчынкі, а самаадданых

і мудрых не праміне заахвоціць падарункамі! Сучаснае пакаленне шмат ведаў страціла, а "за дзедам швэдам" [9] людзі ўшаноўвалі вужа. Ён, як сцвярджае павер'е, затыкнуў сабою дзірку ў Ноевым каўчэгу, а дзірку тую мыш прагрызла...".

Аля слухала бабулю, і тая здавалася ёй такой мудраю – ёй сам герой паданняў гасцінцы носіць! "Які ж добры ўчынак мне зрабіць, каб заручыцца яго даверам?" – разважала дзеўчанё, але бабуля тут жа астужвала гарачыню яе думак. Яна нібыта чула ўнуччана пытанне (не дзіва ж – мудрая...) і цырымонна дадавала: "Добрыя ўчынкі не робяцца назнарок, яны як бы самі "ідуць..." ад шчырага сэрца... ад яснага розуму..."

Напэўна, суродзічаў вужа – вужыху і пяцярых прыгожанькіх вужанятаў Аля бачыла! Яны жылі пад ганкам і дужа шанавалі гаспадыню дома. З пашанаю да не зусім звычайных суседзяў ставілася і бабуля: кожны дзень яна пакідала для іх у сподачку сырадой. Бабулін пачастунак вужыха заўсёды прымала, а вось унуччын – не. Добра, што котка разумела яе роспач і не давала скіснуць смачнаму пітву. Яна прыязна вурчэла і церлася пяшчотнай пыскаю, быццам суцяшала, быццам выцірала сухія слёзы дзяўчынкі. Плакаць было сорамна – усе здагадаліся б, што маці-вужыха не дазваляе сябраваць з ёю сваёй вясёлкавай дзятве, а вуж-мудрэц, як бы

9 Вельмі даўно.

Аля ні дагаджала, гэтаксама яе не мілуе. "...Котцы – і тое на днях цукерку паклаў, а за што?! Што яна такога зрабіла?! Вось я, напрыклад: кожны дзень кароўку на пашу выганяю, сустракаю яе, стомленую цяжарам вялікага дня, сена сушу, – загібала пальцы маленькая гаспадынька, – ваду з калодзежа нашу, посуд мыю, ў хаце прыбіраю, палашчу і качаю[10] бялізну, гародніну паліваю! Чым не добрыя ўчынкі?! Вось так заўсёды, вечна мяне ні з чым пакідаюць... Але адно страшна не любіла дзяўчынка – з бульбоўніка жука каларадскага збіраць... Можа, якраз гэта і перашкаджала быць запрыкмечанаю мудрацом?

Замест брыдкіх вусякаў малая прыносіла бабулі кветкі, а з дзедам на рыбалку хадзіла! За гэта яе частавалі засмажанымі шчупачкамі, утомленымі пад салодкай смятанаю аладкамі, незвычайным чырвоным кісялём, які чэрпалі лыжкамі, і бурштынавым мядком у сотах. Яго можна было разглядаць гадзінамі: фантазіраваць, прадчуваць, згаджацца з дзядуліным сцвярджэннем, што мёд – гэта дар працаўніц-пчол. Але ж дзяўчынка бачыла, як дзед яго на стол ставіў! Ды і лядункі (праўда, набытыя ў аўталаўцы) часцяком перападалі ёй. Аднак уяўленне больш запаляў... ласунак цытрынавага колеру – дарунак загадкавага вужа.

10 У тыя часы, якія апісвае аўтар, вясковыя гаспадыні для разгладжвання тканых вырабаў выкарыстоўвалі адмысловыя драўляныя прыстасаванні, так званыя "качалкі". Адсюль і выраз: "качаць бялізну".



## – 3 –

У той дзень бабуля загадала ўнучцы пільнаваць куранятаў. Пухнатыя камячкі бегалі па двары, а ўваччу стаялі ярка-жоўтыя гарошыны, якія, нібы ў запаволеным кадры, рассыпаюцца па мураве... Згадкі аб салодкім узбуджалі смагу, хацелася піць, а тут яшчэ і паўдзённае сонца да знямогі прыпякае. Толькі Аля адвярнулася зачэрпнуць вады, як яе бакавы зрок улавіў рух. Нешта цяжкое, каменнае, стрымгалоў пікіравала з нябёсаў! У імгненне вока (і сама не зразумела – як!) дзяўчынка апынулася ў цэнтры птушынай чародкі і ўжо адважна закрывала яе ўласным целам. Вочы самі моцна заплюшчыліся ад прадбачання балючага ўдару ў спіну!..



Гэтага не адбылося. Вялізныя крылы расхінуліся за яе плячыма і зноў узняліся ў вышыню, так і не кранушы заступніцу аніводным сваім пяром. Калі тая агледзелася, ля яе ног не хапала аднаго кураня... Як!? Калі!? На гэты раз – слёзы ўсё ж знайшлі выйсце...

Усю ноч думкі пра вялікую моцную птушку не давалі спакою. Аля паважала яе мудрасць і спрыт, але ж і сваіх абараніць абавязана! А паколькі каршун не прычыніў ёй болю, дзяўчынка таксама мусіла прыдумаць у адносінах да яго нейкі бяскрыўдны прыём. І ён знайшоўся. Гэтую няхітрую тактыку яна неўзабаве выпрабавала, і яна спрацавала.

Як правучыць драпежніка, адважную заступніцу навучыла махлярка-модніца, якая жыла на дрэве, але гэта ўжо наступная гісторыя.

# Шпулька чацвёртая

## Махлярка-модніца і яе незабыўны ўрок

### – 1 –

“Знайсці бяскрыўдны спосаб перамогі над ворагам – задача не з лёгкіх...” – дапамагала роздуму маленькае люстэрка. Гэта простая рэч была абавязковым атрыбутам кожнай жаночай сумачкі. І не толькі жаночай – дзявочай таксама, бо, калі па сакрэце, ужо вельмі хацелася хутчэй стаць дарослай. А люстэрка... Яно – як верная сяброўка, як таемны дарадца, як першы памочнік – спрыяла імкненню. Расфарбуе, бывала, вусны чырвоным, ружовай пяшчотай шчокі прыпудрыць, а вейкі няўдала ленінградскай тушшу падвядзе...

### – 2 –

Стаяў самы звычайны пагодлівы дзянёк: курыца-маці мірна выгульвала свае пісклявыя мініяцюркі; нябёсы цешылі блакітнай чысцінёю; шчокі і вусны дзяўчынкі зіхацелі фарбамі... Аля пацягнулася да люстэрка, ды... Божухна – рэч здабыла здольнасць левітацыі! Дзяўчынка паспрабавала ўхапіць яго, ды дзіва-шкло ўхілілася... Кінулася даганяць – і яно наўцёкі... Аж мову заняло: дзе гэта бачана, каб люстэрка планіравала ў паветры, яшчэ і хітрым вокам падміргвала?!

Праз нейкае імгненне ў аб'екта з'явіліся крылы... потым – хвост... На адлегласці выцягнутай рукі з бліскучай здабычай у дзюбе ляцела варона! Так-так, самая сапраўдная варона! Яе чорна-шэрая сукенка пераліваласся чысцінёй. І не дзіва – на тым тыдні духмянае мыла ўмыкнула... завушнічка, як скрозь зямлю праваліласяя... потым памада... за памадаю – пярсцёнак знік... Здавалася – для поўнага шчасця пярнатай модніцы не хапае толькі пацерак, але ж – "яшчэ не вечар"... Трымалася яна спакойна, выяўляючы зусім не абы які інтэлект, бо ляцела згодна разлічанаму курсу – у напрамку, адкуль спадручней накіроўваць на дзяўчо сонечныя водбліскі. Як толькі Аля распачала манеўр па затрыманні зладзейкі, тая адкрыла па ёй чаргу сонечнага адбітку.

## – 3 –

Так непрыемна было адчуваць сябе абдуранай, яшчэ і абстралянай, што ногі самі панесліся ўслед за махляркай. Хацелася нагнаць і адплаціць ёй, чаго б гэта ні каштавала, але ўцякаць варона і намеру не мела... "Ах, ты, пасміхацца надумалася!?" – нярвова паскорыла рух Аля, яшчэ болей раззлаваная стрыманасцю птушкі, ды толькі ад сваіх дзеянняў цярпела паразу пабольш: чарга неадчэпнага водбліску дакладна трапляла ў цэль – у яе вочы! У тую хвіліну дзяўчынцы думалася, што пярнатая шахрайка ладзіцца дапячы ёй. Але, нездарма кажуць: "Злосць – дрэнная дарадца". Ох, і нарабіла б малая глупства, каб не своечасовая здагадка...



Варона, адчуўшы змену настрою, дзелавіта прысела на плот, аднак не адводзіла ад дзяўчыны пранізлівага позірку. У ім чыталіся сумнеў і пытанне: "Дайшло, ці не?.."

У гэты час Альжбэта адчула сябе не па ўзросту дарослай – яна прыдбала сакрэт, які і дарosламу не кожнаму адкрыецца... У яе руках знаходзілася тое, што не параніць, не заб'е і болю не прычыніць!

Праз некаторы час гісторыя з каршуном паўтарылася: у пошуках лёгкай здабычы ён зноў скіраваўся на падворак, каб паснедаць кураняткамі. Аднак, калі Альжбэта навяла на яго люстэркавы водбліск, той не адразу зразумеў, у чым справа: невядомая перашкода не дазваляла дасягнуць мэты! Велічны птах пачаў сумятліва біць паветра крыламі, кідаючыся з боку ў бок. Потым завіс на месцы, жаласна курлыкнуў, нібы абвясціў пра сваю паразу, і знік у вышыні. Больш на іхні панадворак ён не наведваўся.

З вялікай прыязнасцю да сваёй непараўнальнай настаўніцы, Альжбэта прашаптала ёй: "Ты – сапраўды мудрая птушка. Дзякуй за твой незабыўны ўрок! Цяпер я разумею: люстэрка для цябе – не цацка, не за́баўкі... Нясі яго да сябе, няхай ахоўвае спакой тваіх дзетак і ўпрыгожвае ваш дом. Ты вартая ўзнагароды!"

Новая прыяцелька чамусьці і з месца не зварухнулася, нібыта чакала яшчэ нейкіх значных слоў, быццам пыталася вачыма: "А як жа цяперака ты без люстэрка застанешся?"



Спрытная рука дзяўчынкі нырнула ў таямнічую цішыню невялічкага рыдыкюльчыка і адтуль блiснуў прамянёк! Ён адштурхнуўся ад паверхні яшчэ аднаго чароўнага шкельца – у Алі было іх шмат.

Варона, задаволеная маўклівым адказам, знялася са штыкецiны і паспяшалася да свайго гнязда. Не аднойчы Альжбэце даводзілася назіраць: імчацца ад яго сонечныя "кулі" насустрач паветраным драпежнікам, і тыя мяняюць траекторыю палёту.

## – 4 –

Аднойчы ж пярнатая разумніца ўратавала і А́ліна жыццё. Дзяўчынка выходзіла на вуліцу, і толькі павярнулася, каб зачыніць брамку, як атрымала настойлівую вестку з гнязда. Забавілася Аля, задрала галаву і дзівіцца, як варона спраўна сігналіць ёй люстэркам. Ды нешта ў гэтай вестцы не так было, нейкай ўсхваляванай яна падалася... Не паспела дзяўчынка абдумацца, як зусім побач з ёю пранёсся конь! Жарая грыва раздзімалася на несупынным скаку, пад капытамі калацілася зямля, а жывёліна не разумела, што творыць – нешта яе спудзіла. Варона працягвала дасылаць сонечныя плямкі, але ўжо ў вочы раз'юшанага жарабца. Той хутка супакоіўся і спыніўся.

Спявае гняздзечка, а над ім гуляюць залацістыя зайчаняты – ахоўнічкі дабрабыту і жыцця, сяброўскае прывітанне чалавеку.

# Шпулька пятая

## Нечаканая ўзнагарода

### – 1 –

У нядзелю сабраліся госці. У тыя часы людзі заўсёды заходзілі адзін да аднаго ў вольныя гадзіны – жартавалі, спявалі, важна абмяркоўвалі справы мінулага тыдня, нешта планавалі на наступны... Клопатаў было шмат: як наліваецца жыта, ці патрэбен дождж, калі выйсці траву касіць... Гэтым разам узгадалі Альжбэту.

“Якая смелая дзяўчынка, сабою куранят захінула... ды знаходлівая, – цягнулася лагодная гутарка напаўголасу, – што ўдумала... адпугнуць драпежніка люстэркам... такое мог прыдумаць хіба што мудрэц... А яна... У яе гады... Гэта – сапраўднае вынаходніцтва... Яна вартая ўзнагароды...”

Незразумелае пачуццё сцяла рукі і ногі ад хвалы, якую, як думала Аля, заслугоўвае не яна, а прыдумшчыца-варона. А тут яшчэ і думка падражнівае, што дарослыя, даведаўшыся сапраўдную гісторыю, падымуць яе на смех... Усё ж Альжбэта набралася смеласці і зрабіла поўны пералік падзей. Сказаць па праўдзе, знаходзіцца пад прыцэлам людскіх думак аказалася больш складана, чым пад дзюбай магутнага каршуна ці пад абстрэлам вароніных настаўленняў.





## – 2 –

– Во, напляла кашалёў!.. – прамовіў нехта з'едліва, але выступоўцу ніхто не падтрымаў, і напружаная цішыня замерла ў памяшканні. Як гэта зразумець, Аля не ведала, як не ведала, якой лініяй паводзін кіравацца... У такія хвіліны заўсёды з'яўляўся, нібы той анёл, спадар Дыда.

Вясёлы балака Дыда – душа кампаніі – з'явіўся, як заўсёды, нечакана і, як звычайна, дарэчы! Ох, і дасталася ж у той дзень падарункаў збавіцельцы-вароне! Дзяўчынка шчыра радавалася: яе пярнатая прыяцелька атрымала ўзнагароду ад самога вужа-мудраца!

...А пра А́ліну споведзь ужо ніхто не памятаў. Забылася і яна сама. Але ж не забылася толькі адна, самая загадкавая істота...

## – 3 –

Усё як заўсёды: рыкалі каровы, якія сыходзілі на луг; салодка пах ранішні дымок; упарты прамень гулліва кранаў павекі... Напэўна, ён спяшаўся данесці нейкую важную навіну. Калі Аля прадзерла вочы, крыху складана было зразумець: гэта працяг захапляльнага сну ці рэчаіснасць?.. Ля падушкі ляжаў пачок цытрынавага дражэ, а на яго рэльефна-жоўтым аксаміце зіхацелі крышталікі цукровага пяску!

Да сённяшняга дня не разгадала Альжбэта загадку, за што вужчараўнік узнагародзіў яе такім жаданым ласункам?

# Шпулька шостая
## Слова з кішэні

### – 1 –

Жартаўнік – яшчэ той! Калі якія спрэчкі сярод людзей успыхнуць ці, барані Бог, біцца пачнуць – там Дыда са сваімі жартачкамі ўзнікне, нібыта сам Божачка прышле. Тыя і забудуцца, аб чым спрачаліся...Чаму мужчыну так называюць людзі, ён і сам не ведаў, затое ведалі ўсе, чаму ў аднавяскоўца носа няма.

### – 2 –

Велікадушны чалавек падарыў свой нос мядзведзю, якога нядобрым словам параніў. Сам дзядзька Дыда заўсёды казаў так: "...Зарадзіў я, значыць, самае крыўднае слова, ды... да як бабахну!..

Здарылася гэта на паляванні. Узяў я на мушку самую сытую вавёрку. "От, – думаю, – каўнер атрымаецца!" А сам, аж не дыхаю, так цэлюся. Чую, нехта мяне за плячо, значыць, кратае. Я раз адмахнуўся, другі раз... а потым цікава стала, можа, хто свой... Павярнуў я, значыць, галаву, ажно мядзведзь стаіць! "Навошта ты, братка, – кажа, – сястрыцу губіш?" Тут я і пашкадаваў, што толькі шрот з сабою ўзяў, не думаў, што звер сам на



мяне выйдзе. Ды... да такі кажух у яго зайздросны, гэта вам не які-небудзь каўнер!.. Ну, думаю, – браць трэба! А як, калі стрэліць, значыць, няма чым? Не доўга думаючы, узяў, ды... да зарадзіў сваю дубальтовачку самым брыдкім словам, тым больш, па яго нават у кішэню лезці не трэба! Хацеў з панталыку звера збіць, кажушок зняць, а пакуль той ачомаецца – ўцячы. Ды... да, як пальну са ўсяго свайго дуру па мядзведзевых вушах!..

...Эх, прамахнуўся – не ў вушы трапіў, а насапырку яму знёс!

Кінуўся, значыць, мядзведзь на паваленае дрэва, абхапіў морду лапамі, ды... да як зараве на ўвесь лес: "Ай, гора мне, гора! Як жа мне, беднаму, без носа жыць? Ох, прападу без нюху ў лесе! Ой, прападу!.."

Сорамна мне стала. На душы – аж каты скрабуць... Сеў я побач са сваёй гаротнай здабычаю, паляпаў, значыць, далонню яе па плячы, ды... да кажу: "Пакрыўдзіў я цябе балюча, Міхайла, а як, значыць, віну загладзіць, – не ведаю..."

Сціх мядзведзь ад такога раскаяння, ды... да пачалі мы разам думаць, як выправіць становішча. Думалі, значыць, думалі, ды... да ўзгадаў я: у мяне нос занадта нюхаты!

– Слухай, – кажу, – а забірай мой: і табе карысць, і я ў даўгу не застануся!

– Гм-м-м, – касавурыцца той, – а якая мне карысць ад чалавечага носа?



– Дык сам і падлічы, Міша, – пачаў загінаць мядзведзевы кіпцюры я, – у цябе, значыць, нюх будзе, ды... да яшчэ які! – гэта першая і самая галоўная карысць; другая карысць, ну, неймаверна спадручная – цябе ж, з такім носам, Міхайла, усе твае лясныя браты паважаць пачнуць; будзе, дружа, яшчэ і трэцяя карысць, неацэнная! Возьме цябе, напрыклад, які-ніякі паляўнічы на мушку, ды... да здзівіцца. Пакуль гадаць будзе – звер перад ім ці чалавек, ты – шмыг той хвілінай за елку... з носам, як кажуць, яго і пакінеш! Бяры, Міша, пакуль даю, а то я і перадумаць магу... Паспрабуй. Не спадабаецца – вернеш. Узрадаваўся касалапы – гэта ж якая перспектыва яму, значыць, свеціць!.. Ды... да і згадзіўся.”

## – 3 –

Вяскоўцы казалі, што чакаў яго спадар Дыда і дзень, і тыдзень... Усё думаў – мядзведзь ахвяру верне. Ужо і гадкоў колькі мінула, а мядзведзь носа не тое што не вяртае, нават не паказвае...

Казалі, што пасля той сустрэчы Дыда іншым стаў: чулым, добразычлівым, а перш, чым слова якое вымавіць, разоў некалькі ў кішэню па яго нырцане... А яшчэ сярод людзей чуткі хадзілі, што гэта зусім і не мядзведзь быў, а сам Бог пераапрануты. Кажуць, што прыйшоў ён, каб даведацца, ці праўда, што людзі сумленне страцілі? Ці праўда, што ўсё часцей адзін аднаго словам забіваюць, а зямны суд такое і за злачынства не лічыць? Ды, бач, Дыду сустрэў! Хацеў яго Божа моцна пакараць, ды ўзгадаў, што зліташаўся чалавек, не даў зверу без носу прапасці – свой ахвяраваў. Так і адпусціў небараку з наказам: "Памятай, братка: дурное слова не толькі з панталыку збівае, але і забівае; яно не толькі насміхаецца, а і назад вяртаецца! Сёння – носам разлічыўся, а заўтра, братка, чым?.."

## – 4 –

"Ну і, добра! – радуецца спадар Дыда. – Мне без гэтай часткі твару яшчэ і зручней: не лезе, значыць, абы куды; вакол носу ніхто не абводзіць. Ды... да наогул – хіба я не прыгожы?"

І сапраўды, нягледзячы на тое, што замест носа зеўрала дзірка, мужчына меў прыемныя рысы твару, аднак найбольш прыцягальнай яго прыгажосцю была шчырая душа. Аля паважала спадара Дыду больш за ўсіх і не аднойчы заўважала, як перад ім людзі слупянеюць, калі нешта не тое языкамі пляскаюць. Ён быў мудрым чалавекам і ўжо адным сваім існаваннем нагадваў кожнаму: перш, чым узброіцца словам, лепш па яго сем разоў у кішэню злазіць.

# Шпулька сёмая
## Паганіні

### – 1 –

Гарэза-ветрык незнарок калыхнуў партрэт на сцяне... З яго ўсміхнуўся дзяўчынцы зусім яшчэ маладзенькі бацька з гармонікам. Вобраз нібы ажыў у рамцы: пальцы ўзляцелі над грыфам, рабрысты мех расцягнуўся і заліўся пераборам. У такт яму прыгожа шчоўкнулі драўляныя шпулькі, на якіх трымалася шырма-фіранка. Тая варухнулася... Вольныя хвалі затанцавалі па стракатым полі тканіны, гойдаючы струну, і яна напеўна загула... Ледзь улоўная мелодыя пачала запаўняць прастору пакоя, і Аля міжволі патрапіла ў яе таямніцу.

### – 2 –

Мясцовы Паганіні так прыгожа іграў на гармоніку, што немагчыма было ўтрымаць ні рук, ні ног – яны пускаліся ў скокі самі. Яго безыменны палец не гнуўся, быў пакалечаны, таму віртуозны перабор вылятаў толькі з-пад чатырох пальцаў. Нябачаная дзёрзкасць! Аднак менавіта яна ўзнагароджвала музыканта яшчэ большым піетэтам. Здавалася, знямелы палец-персцянец ніяк не ўдзельнічае ў стварэнні му́зыкі. Насамрэч, лунаючы над іншымі, ён нібы заклікаў іх у натхнёны палёт. Пальцы лёгка гарэзавалі над чорна-белымі

кнопкамі гармоніка і акрылялі не толькі самога Паганіні, але і слухачоў. Блакітныя вочы, якія прамянелі чыстым святлом, і не ў тэрмін ссівелы чубок сапернічалі з глыбокай загарэласцю твару. Гэта падбаўляла сталаму мужчыну гадоў дваццаць, а то і ўсе сто вякоў, што прыпадабняла яго да нейкага забытага бажка. Яго быццам бы спусцілі сюды з нябёсаў ці то выпраўляць нейкія асабістыя сваволніцтвы, ці то ўпрыгожваць існаванне людзей.

Чаму бацьку называлі імем вядомага скрыпача – для Алі заставалася загадкай. А паколькі ён быў сапраўдным віртуозам ад прыроды, у дзяўчынкі склалася сваё тлумачэнне гэтаму. "Верагодна, – думала яна, – мянушка мімаволі "прыліпла" да таты таму, што землякі часта параўноўвалі свайго маэстра з талентам іншага народа. Ды і падобныя яны на здзіўленне: аднолькава харызматычныя, смуглявыя. А гэты высокі лоб! А нос гарбінкай!". Аднак, як пазней высветлілася, гарманіста і скрыпача аб'ядноўвалі не толькі талент і імя, але і яшчэ адно ўражальнае супадзенне.

## – 3 –

Яшчэ зусім маленькім хлопчыкам Міколка выдатна валодаў фісгармоніяй і скрыпкай. Падчас вайны, калі яму споўнілася гадоў дзесяць, у іхніх мясцінах разгарнуўся адзін з нямецкіх гарнізонаў. Фрыцы па-гаспадарску выходзілі ў поле і касілі жыта тутэйшых сялян. Аднойчы з лесу пачуліся стрэлы. Нехта не вытрымаў – забіў касцоў.

Ашчэрыліся немцы! Уздыбілі аўтаматы, сталі зганяць вяскоўцаў – старых, малых, жанчын. Жах! Пярэпалах! Але скрозь гвалт, плач, сабачы брэх, нібы ціхі ручай ў шалёным віры, палілося нягучнае сола скрыпачкі.

Людзі змоўклі. Расступіліся. На ўзрытай злосцю і выбухамі зямлі стаяў падлетак і выводзіў смычком... пачуцці. Ніхто не адважваўся паварушыцца, нават калі му́зыка сціхла. Здавалася, яна абдымае ўсіх – і ворагаў, і сваіх.

Неўзабаве з нямецкага боку выйшлі трое. "Ты – талантливый малчык, – прамовіў адзін з іх на ламанай рускай мове, – однако... на чэтырьёх струна можэт играт всие!"

Гітлеравец павярнуўся да людзей. У гэтую хвіліну для тых, хто чакаў прысуду, бадай, спыніўся час і запаволіўся ток крыві ў жылах. Твар нямецкага афіцэра катэгарычна застыў. Здавалася, вось-вось лопнуць нацягнутыя жаўлакі, але ж... Войкнула скрыпка – белыя пальчаткі абарвалі тры яе струны. Немец дэманстратыўна падняў скалечаны інструмент і абвясціў, што адменіць пакаранне, калі хлапчуку ўдасца разжаліць яго!

І струна заспявала... Нібы расчуленыя багі кранулі яе. Яны зазірнулі ў свет людзей паміж сваімі справамі і здзівіліся: тут, ужо не над маленькай цудоўнай планетай, а над полем бою, нібыта птушка, якая забылася пра сілкі і небяспеку, лунаў музыка...

Кропелькі крыві падалі на пясок. Гэта парваныя струны, абкруціўшыся вакол, раздзіралі плоць безыменнага пальца "Паганіні!" – так потым ахрысціў

хлапчука нямецкі афіцэр. А цяпер ці то захоплены ігрой на скрыпцы, ці то ад страху, Міколка не чуў пад сабою ні ног, ні зямлі, ні нават болю. Было толькі бачна, як хлопчык моцна сціснуў зубы, як дрыжаць яго каленкі, як ён намагаецца не выпусціць скрываўленага смычка... Не па ўзросту дарослы, як і ўсе дзеці вайны, ён ведаў адно: за ім – дзясяткі жыццяў.

*З маленькай далані струменіць хараство –*
*Спатольваюць здарожаныя смагу.*
*Нібыта дробязь у бязмежжы... А прад ёй*
*Здымае капялюш сама знявага!*

*Мелодыя віецца над зямлёй –*
*Час перапынку...*
*А каму – глыток*
*Жыцця.*



## – 4 –

Скончылася вайна. Цяжка давялося ўсім. Удзячным за жыццё суседзям хацелася хоць як аддзячыць збавіцелю-Міколку, але што яны маглі? Бульбіну, аладку з ліпавай кары – калі была, бо самі галадалі.

На сямейнай нарадзе вырашылі: каб выжыць, неабходна прадаць фісгармонію і скрыпку, якім бы балючым ні было расстанне.

...Стары конь не адразу крануўся з месца. Яго панукваді, хвасталі па крыжы пугай, трэслі цуглямі, але нават ранішнія прыцемкі не схавалі пільны погляд разумнай жывёліны. Як толькі хлапчук адпусціў каня сэрцам, той ляніва пацягнуўся ў маўклівую імглу наваколля.

Калі бацькі вярнуліся з кірмашу, каля падводы стаяў дубовы цэбар, які адліваў абнадзейлівым золатам зерня, і цёпленькая чырвоная кароўка. Завіхалася матуля, змучаная доўгай дарогай. Аднак хлёсткасці яе рухам надавалі кватчастая хустка, якая ўжо красавалася на плячах, і беражліва перакінуты праз руку спраўны касцюмчык для сына. Добра стала ў Міколкі на сэрцы, спакойна. "Ох, і зажывём!" – падумаў ён, але нешта было не так... Неяк нязвыкла без дарагіх душы рэчаў, пуста. І хлопчык кінуўся да воза...

З дзіравага мяшка ўсміхаўся белазубы гармонік! Новыя сябры так узрадаваліся знаёмству, што ў тую ж хвіліну як абняліся, так да апошніх

сваіх дзён не разлучаліся! У горы, і ў шчасці, заўсёды разам – мясцовы Паганіні і яго двухрадка.

## – 5 –

Той прыгожы дзень з сямідзясятых Аля запомніла на ўсё жыццё. Аконнае шкло аздаблялі бліскучыя караліі павуцінак, у якіх адбівалася рознакаляровасць жнівеньскіх фарбаў і раскоша мірных нябёсаў. Там-сям над агародамі ўжо падымаўся лёгкі дымок ад вогнішчаў, што навяваў прыемную стому. Млява цвыркалі конікі ў траве. Заміранне парушыў паспешлівы ляскат веснічак: паштарка Надзея несла невялічкую паперу.

Рукі Паганіні хвалююча дрыжалі... Вочы, якія яшчэ паўхвіліны таму загарэліся ажыўленымі агеньчыкамі, пачалі патухаць у непаразуменні – нешта паведамляў дакумент, але – што?! Сабраліся людзі. Весткі хутка разносяцца па вёсцы. Кожны, хто ўмеў, і не ўмеў чытаць, прабегся вачыма па радках ліста... Папера была напісана па-нямецку.

– Не журыся, Мікола, – умяшалася тут Надзея, – бяры пашпарт, ды на пошту, там усё растлумачаць!

## – 6 –

Кажуць: горш няма, як чакаць і даганяць, аднак не разыходзілася грамада, чакала. Як ніколі, цягнуўся час: на пошту – нібы на край свету... Неўзабаве кожнага апанавала хваляванне – удалечы на вясковай вуліцы дарожны пыл закруціўся загадкавай эйфарыяй...

Вялізныя вочы, поўныя болю і ўрачыстасці, адплаты і ўсёдаравання, маўчалі і размаўлялі з кожным. Твар Паганіні збялеў. Мужчына нешта сціскаў у кулаку да несцярпення, да здранцвення... І не адразу раскрыў яго – не слухаўся дух. Чамусці цяпер, калі час пачаў засыпаць сляды вайны, заўсёды бясстрашны і адважны Мікола стаяў збянтэжаны перад землякамі.

...Пальцы выпрасталіся. На далоні гулялі мяккім пералівам тры скручаныя струны – пасылка з Германіі.

– Вось, яна, перамога... – толькі і выдыхнуў ён.

# Шпулька восьмая

## Лунсовая гісторыя

### – 1 –

"Нізкі паклон табе, рыбак: адзін ты і размаўляеш цяпер з нашай Вольсаю... больш няма каму... Параз'язджаліся... парассыпаліся хто куды... Праўду некалі казаў А́ртур-Арту́р, – сціснулі сэрца жанчыны ўспаміны, – што разляцімся, як птушкі, кожны ў свой вырай... Зажурылася. Змялела Вольса. А раней, так разлівалася ў гэтым месцы, што нават улетку пад сваімі падпахамі мост хавала... Калісьці гушкала нас на далонях, разам з намі смяялася, жартавала: каго па жывоціку пляскане; каму плаўкі жвавай хваляй падчэпіць; каго з ног да галавы ружовымі пырскамі благаславіць...

Не пазнаць... зарасла... Толькі вада, як была ружовай, так ружоваю і засталася. Відаць, мае прыяцелькі-бродніцы[11] не сышлі, так і вырошчваюць *тут* свае дзівосныя сады... Добрая, значыць, рака, цёплая... А можа,

---

11 Бродніцы - ў старажытных славян духі, захавальніцы брадоў, мілавідныя дзяўчыны з доўгімі валасамі. Паводле паданняў, Бродніцы жывуць разам з бабрамі ў ціхіх затоках. Яны ахоўваюць брады, зробленыя з галля і пільнуюць, калі ж вораг употай пачне падбірацца. Бродніцы непрыкметна руйнуюць брод, накіроўваючы непрыяцеля у твань або ў вір. Добрым жа падарожнікам - паказваюць, дзе размешчаны брод.





бродніцы мяне і цяпер бачаць, радуюцца сустрэчы?" І перад вачыма Альжбэты ўжо была не плынь ракі, а кадры старой кінаплёнкі з гісторыяй яе падарожжа, якое адбылося ў далёкім дзяцінстве.

## – 2 –

Ад большасці іншых беларускіх рэчак, гэтая – пунсовай вадою адрозніваецца. Колькі ні дапытвалася цікаўная Аля ў старэйшых, чаму Вольса "Вольсай" завецца, і чаму пунсовага колеру ваду нясе – заўсёды атрымлівала адзін і той жа невыразны адказ. Ці ведалі яны, што казалі? Маўляў, рака бярэ пачатак пад алешынай – таму і назва адпаведная, а колер надае тарфянік, у якім вадзянік[12] рэчышча праклаў.

Не! Не жадала дзяўчынка згаджацца з гэткім банальным тлумачэннем. Ну, не можа быць, каб такая рамантычная рака не мела сваёй захапляльнай гісторыі! Напэўна, яна нейдзе згубілася. Не збераглі, не захавалі яе людзі, як не захавалі большасць сапраўдных гісторый... І Аля пачала сваё незалежнае расследаванне.

---

12 Вадзянік, вадзяны дзед і інш. – у старадаўніх павер'ях многіх народаў: дух-увасабленне стыхіі вады; уладар пэўнага вадаёма і жывых істот у ім. У беларускім міфалагічным светаглядзе – адзін з духаў падводнага гаспадарства. Лічылі, што вадзянік жыве ў вірах рэк, асабліва каля млыноў (такі зваўся "вірнік"), на дне азёр, крыніц, глыбокіх калодзежаў ("ціхоня").



## – 3 –

“Пайду, – думае, – у берагавых ластавак запытаюся. Яны жывуць у самых нетрах зрывістага яра, дзе пракладваюць доўгія калідоры... За тымі лабірынтамі – была ўпэўнена дзяўчынка – абавязкова знойдзецца нейкі казачны схоў, у якім размаляваны куфэрак на ланцугах гойдаецца, а ў ім – прыгажуня-гісторыя спачывае...”

Ластаўкі выканалі чароўную араторыю пра той казачны куфэрак. У ім, як выявілася, іншае таемства адбываецца – там нараджаецца мелодыя...

Часцяком погляд дзяўчынкі заміраў на мячэўніку, які купкай рос на тым беразе. “Стаіць сам сабе, адасоблены, ні з кім не размаўляе... увесь такі загадкавы... Можа, якую таямніцу хавае? – нараджалася пытанне. – Ці не даведацца мне ў яго пра гісторыю-прыгажуню? Напэўна, яна шыкуе ў пухнатых вежах расліны, а пра тое, што час да людзей вяртацца – забылася”.

Красун-мячэўнік толькі і прашамацеў чарговыя прымхі, якія дзяўчынцы даводзілася чуць кожны дзень і ад сваёй бабулі, і ад бабуль яе сяброўак, асабліва, калі тыя разам збіраліся...

Хацела неяк у гадзюкі пацікавіцца... Тая грацыёзна віхляла па арнаменце рачной стужкі, ды сама адчула настрой юнай даследчыцы. Гадзюка даслала радок бязмоўнай блясквы, і Аля зразумела: “праўду



на паверхні не шукаюць, яе намацваюць глыбей", і яна нырца дала. Потым – яшчэ... І яшчэ...

Ружовую ваду, нібыта рампа, прасвечвала мяккае сонечнае святло. У ім кружлялі роўна вытанчаныя балерыны, пясчынкі ды іншая рачная дробязь. Ім і справы не было да таго, у якой сцэне яны задзейнічаны, галоўнае – што яны танчаць, і імі захапляюцца... Што з іх узяць?

"О! – ахінула думка дзяўчынку. – Трэба ў кароў спытаць. Яны гадзінамі стаяць нагамі на самым дне Вольсы ды свежымі навінамі падсілкоўваюцца. Хутчэй за ўсё, сярод паўсядзённай інфармацыйнай мішуры і нешта карыснае трапіла...

– Можа, калі і шмыганула твая гісторыя, ды дзе тут разбярэш, калі ўсё з глеем змешана. Паглядзі, колькі яго з дна ўсплывае... – прамыкалі рагатыя карміцелькі. – Ідзі да кубышак, іх карані глыбей нашых капытцаў гуляюць. Яны, як піць даць, ведаюць.

Аля і пашнуравала.

Кветкі схілілі галоўкі ў прывітальным паклоне, бо ўжо даведаліся, з якой патрэбаю Аля – каровы па хвалях перадалі...

– Карані нашы і сапраўды шмат чаго ведаюць, але ж... Паглядзі, на якіх доўгіх цыбурах мы стаім. Паку-у-уль да нашых мазгоў што-небудзь дойдзе... Хочаш, сама з каранямі пагутары, а мы табе дапаможам. На вось,

дзве сцяблiначкi: праз адну, як праз саломiну дыхаць будзеш; другая сцяблiнка – срэбная... "Нiтачка жыцця".

Спускайся па ёй, а каб плынь не знесла, мы трымаць яе будзем. Ёю ж i на зваротным шляху скарыстаешся.

– 4 –

Дзень думала Аля, думала ноч: як жа па той нiтачцы ў лёхi зямныя трапiць, ды яшчэ пад вадою? Але iншага шляху не было, i даследчыца наважылася. Толькi пачала пад глей падкопвацца, як тую яе "нiтачку" нехта – чак, i абрэзаў. Чуе: гарлачыкi загаласiлi – Алю згубiлi. А дзе яны галосяць? – Не зразумець. Кiнулася дзяўчынка ў адзiн бок, кiнулася ў другi, ды рады не дасць. "Ну, усё, – думае, – вось i пара мая надышла..." Ды дзе там – адусюль каранi збеглiся! Адны за рукi, другiя за ногi ўхапiлiся, ды давай цягнуць, прагчыся! Кожны ў свой бок стараецца! Яна ажно вочы заплюшчыла, чакае. Але – не: акурат на сто шэсцьдзесят тры сантыметры расцягнулi – тут i спрэчкi спынiлiся. "Ох, – думае, – прыадчыню ж я адно вока, падгледжу, што адбываецца?"

Не адразу воку паверыла: стаiць яна на даху чырвонага палаца – вялiзнага, незямной прыгажосцi! Зiрнула праз яго празрыстую чарапiцу ўнiз, ды здзiвiлася: па каланадах ды арках пунсовыя лiлеi ўюцца, квiтнеюць. Палiваюць iх напаўпразрыстыя прыгажунi! Гэта Берагiнi-бродніцы





завіхаюцца, сады свае даглядаюць. Сукенкі, містычнымі краўцамі шытыя, рознымі ўпрыгожваннямі паблісківаюць. Доўгія валасы, нібы багавінне, калываюцца, да Аліных пятачак дастаюць, быццам бы нешта на іх запісваюць... Казытліва, але трывае дзяўчо, няма калі рагатаць – такой любаты, за ўсё сваё жыццё не бачыла! Стаіць – рот разявіла... аж саломіна выпала (угору, праўда).

– Мір вам! – прабурболіла Аля, забыўшыся, што на апошнім дыханні. – Якія цудоўныя гарлачыкі! А я толькі жоўтыя ды белыя бачыла. Чаму вашы – чырвоныя? Можа, сакрэт які ведаеце?

– Увесь сакрэт – у альховых палях, на якіх трымаюцца калоны, на якіх ляжыць дах, на якім стаіш ты... – азваліся дзівы. – Кара́ алешыны – яшчэ які фарбавальнік! Яна дае чырвоны колер. Бачыш, нават лілеі, абвіваючы сабою калоны, маюць тут адпаведнае адценне. Мы любім гэтае месца: тут вельмі камфортна нашым кветкам, а мы часам на іх варожым... А ты ведаеш, як на лілеях варажыць?

– На лілеях?! – пачасала патыліцу Аля. – ...На зямлі на рамонках варожаць...

Панны, смеючыся, сабраліся ў кружочак. Кожная адарвала па некалькі чырвоных бутонаў. Ад гэтых бутонаў яны адшчыквалі пялёстак за пялёсткам і прыгаворвалі: “Любіць, не любіць...” Тым часам пялёсткі,

нібыта легкакрылыя зграйкі рыбак-матылёў, плаўна разляталіся па падводным раздоллі, аздабляючы сабою плынь. Тут дзяўчынка і зразумела – чаму Вольса ружовае адценне мае!

## – 5 –

Яе дапытлівасць была задаволеная. Цяпер і дадому час: па-першае, бабуля хвалюецца; па-другое, усе рэкорды па затрымцы дыхання пабітыя некалькі разоў запар; па-трэцяе...

– А па-трэцяе... – падхапілі вадзяныя гарэзніцы, – звярні, калі ласка, увагу, якое гэта зручнае месца для нашых пабудоў! І тут галоўную ролю іграюць альховыя апірышчы. Надта ж яны ўстойлівыя да вільгаці, нават пад вадой. Людзі з даўніх часоў



выкарыстоўваюць іх для ўзвядзення палацаў, млыноў, мастоў. Ім гэты сакрэт падаравалі нашы браты-бабры. Мы таксама пабудавалі мост – бродам называецца. Расплюшчы другое вока, ці падабаецца табе наша тварэнне?

Калі Аля абодвума вачыма абвяла наўкруг, то была невымоўна здзіўлена: яна бойка тупала да свайго берага ўброд, несла бабулі букет ад рачных дзеў – пунсовую гісторыю, а на левай назе чырванеў шаўковы пялёстак лілеі – сведка небяспечнага падарожжа.

# Шпулька дзявятая

## Язэпава маляванка

### – 1 –

Паркалёвая шырма напышліва ўсміхалася, калі захінала сабою старадаўні дыванок. Ён ціхенька дажываў свой век над дзедавым ложкам і нават саромеўся ўласнай нікчэмнасці.

“Вісіш тут, быццам прырос, вочы мазоліш, абарванец!” – глумілася з яго шырма. Ёй было чым ганарыцца: сучасная, лёгкая, стракатая; заўсёды запатрабаваная, заўсёды рухомая... Яна вольна звешвалася з драўляных шпулек і эмацыйна імі пляскала.

Услед за шпулькамі пачынала гусці струна. Яна заўсёды падтаквала шырме, таму дыванку думалася, што ўсё ў гэтым свеце супраць яго. Ён вінавата апускаў вочы, бо нічога не мог зрабіць ні са сваім зусім не модным адзеннем, ні з узростам, ні са становішчам, але пазіцыю не здаваў... Заціснуты паміж печкай і шафаю, ложкам і столію ён адкрываў вачам цікаўнага гледача белую альтанку, якая патанала ў квецені фантазійных руж. Па роўнядзі невялічкай сажалкі, на першым плане, маўкліва слізгацела пара лебедзяў, а з глыбіні альтанкі за ёй назіралі закаханыя.

Яны, відаць, аб чымсьці думалі, марылі... Усё тут здавалася загадкавым: і гэты чорны фон, на якім быў намаляваны сюжэт, і сам жывапісны наіў. Нягледзячы на простую, прымітыўную размалёўку ды абтрапаныя ражкі, ад дыванка немагчыма было адарваць позірк – так вабіў ён нейкай сваёй меланхалічнай сардэчнасцю. Адной толькі шырме і справы не было да таго, што там на ім намалявана і якія пачуцці абуджае сюжэт. Яна дэманстратыўна шыкавала перад суседам новай сукенкаю, а тую, як на ліха, развяваў плыўнымі хвалямі хатні скразнячок, быццам і ён быў заадно з ёю. Крыўляка незадаволена чмыхала ў нос: "Фі, які ты пыльны, а-а-а-пчхі! У мяне на цябе алергія! Не дзіва, што з табой сябраваць ніхто не хоча – ад твайго выгляду адзін толькі змрок на душы."

## – 2 –

І сапраўды, дыванок часта заставаўся адзін. Сябры тады яшчэ не разумелі, што ён проста не хацеў быць кожнаму з іх цяжарам. Аднойчы ж і зусім зажурыўся. Ружовыя бутоны, здавалася, панiклі ад сораму і крыўды, альтанка – абязлюдзела... Гэта здарылася паўдзённай парою, калі вяскоўцы хаваліся ў хатні халадок. Да бабулі завітала суседка, натхнёная важнай навіною. Відаць, наўмысна прыйшла... Крыху пасядзела моўчкі, потым і кажа:



– О-о-о-о, даражэнькая, бачу, ў цябе дыван зусім нязграбны вісіць! А ў мяне-е-е... модны, квяцісты, пальцы на тры таўшчынёю; дзеці з горада прывезлі! Самі выбіралі, самі чаплялі – на ўсю сцяну атрымаўся. А твае чаму не памяняюць гэтую старызну?.. Хіба грошай мала зарабляюць?..

– 3 –

Ганарліўка-шырма вышэй за ранейшае нос задрала – яе самалюбства было ўсцешанае, а спадзеў, што неўзабаве каля яе паселіцца новы сусед, надаў яшчэ большай фанабэрыі.

Бабуля нічога не адказала суседцы, а потым, калі тая пайшла, неяк ласкава паглядзела на свайго

насценнага сябра і сцішылася. У блакіце вачэй запалілася цёплае святло. Ажылі падзеі мінулага. Гэта было падобна на нямое кіно, хуткае, няўлоўнае, дарагое... Мільгацелі фігуры, цені, эпізоды, без перапынку граў гадзіннік-тапёр... Недзе паміж тактамі ледзь прыкметна тарганулiся прыгожыя бабуліны рукі, якія нібыта заснулі на мазаіцы хатняй сукенкі. Як нешта іх абудзіла: можа неспадзяваны ўспамін усхваляваў, а можа, брамка, ляснуўшы ў двары завалай, вярнула жанчыну ў сённяшні дзень...

## – 4 –

Зразумела, што гэта просценькая, немудрагелістая рэч была для яе даражэйшаю за ўсе самыя каштоўныя, самыя навамодныя. Але чым? Бабуля абвяла вачыма пакой, унукаў, і, нібы адчуўшы агульнае пытанне, пачала сваю нетаропкую споведзь.

“Хадзіў да вайны па вёсках мастак – шырокай душы і шчырага сэрца чалавек, дыванкі вось такія маляваў. Ён хацеў, каб і вясковаму чалавеку жылося з цікавінкаю. Звалі яго Язэпам, таму і маляванка – Язэпава. Але ён не толькі маляваў, яшчэ вучоным быў ды лекарам знаным. Любіў яго люд... Дзе б ні спыніўся Язэп, адусюль да яго сыходзіліся: хто пешкі, хто на фурманках траплялў.

...У кожнага да Язэпа свая справа была. З нашых Вусціння з Андрусём хадзілі – у іх дзеці доўга не нараджаліся. Творца сам адчуваў, каму што



намаляваць: каму лісіцу накідае, каму – птушку з кветкамі, а некаторым нават касмічныя бегі на палатне ствараў... Малюе, бывала, і ціхенька, нібы сам з сабою, размаўляе, ды не проста размаўляе, а вершамі. Ох і прыгожа ён іх чытаў! Але, хутчэй за ўсё, гэта гімны былі. Яны гэтаксама ў рыфму вымаўляліся, як вершы. Некалі, не за нашай памяццю, нашы дзяды да нябёсаў гімнамі звярталіся.

У хуткім часе ў Андруся з Вусцінняю хлопчык нарадзіўся, Язэпкам назвалі. Як дазналася пра гэта Фруза Акімава – бягом да Язэпа! Яе сын у Першую сусветную без вестак прапаў. Да каго яна, бедная, толькі ні звярталася: і да шаптуноў, і да варожак – ніхто рады не даў. А пасля Язэпа, гады праз тры, і ёй пашэнціла: сына знайшла. Ён у Англіі жыў, ледзь не кожны дзень лісты ёй пісаў... Але яны да маці не даходзілі.

...Грошай Язэп не браў, больш харчы прымаў, а калі бачыў, што перад ім зусім бядняк – задарма дапамагаў. Памятаю, прыехаў да яго нейкі заможнейшы чалавек – фарбы, пэндзлі прывёз, кнігі цікавыя... Як жа Язэп радаваўся, нібы малец! А яшчэ кветкі жывыя надта любіў. Жанчыны заўсёды яму букеты прыносілі. Мастак доўга ўглядаўся ў суквецці, назіраў за подыхам пялёсткаў, а потым з-пад яго пэндзлікаў нараджаліся планеты ды галактыкі. Язэп казаў, што праз кветкі космас пазнаць можна, што кожная красачка – гэта планета, толькі ў мініяцюры: колькі розных кветачак існуе



на зямлі – столькі і царстваў касмічных у нашай галактыцы. Як кожная прыгажуня паводзіць сябе тут, на зямлі, так і яе планета пачуваецца ў непазнаным сусвеце...

...Апранаўся мастак ахайна, от што цікава. Як ні завітаеш – свежанькая кашуля, прычэсаная барада. А калі паспяваў? Нават праз знешні выгляд выказваў павагу да чалавека, а ставіўся Язэп да кожнага з пашанаю. Нават да самага будзённага – а як да караля... Кожнага выслухаць умеў, кожнаму дапамагчы. Вось у каго належала вучыцца – людзі ніколі не паднялі б адзін на аднаго зброю. Не варта – разумелі б яны – псаваць шлях да сябе таму, хто нясе запалкі для вогнішча... Асабліва Язэп перад жанчынаю схіляўся. "Жанчына, – казаў ён, – гэта боства, бо яна – маці". Вось і не губляліся ў матуль дзеткі сілай Язэпавага слоўца. А моц у яго была-а-а – аж да самых вяршынь дасягала!

... І мае, вось, дзеткі, вайну перажылі"...

## – 5 –

Голас старой змоўк. Яе думкі сталі зразумелыя без слоў... Цішыня ўсталявалася паўсюдная: нават мухі на шыбінах сцішыліся. Усе паглыбіліся ў задуменне.

Неўзабаве пачуліся чыесьці ўсхліпы – гэта расчулілася шырма... Яна уткнулася носам у грудзі дыванка і залямантавала:

– Прабачце, спадар Дыван! Я ніколі-ніколі не буду Вас крыўдзіць, і, ведаеце, я невымоўна шчаслівая, што ў мяне такі... такі выдатны сусед! А давайце сябраваць!

І яны зачапіліся на знак прымірэння нітачкамі.

Словы прызнання наталілі завялыя ружы жыватворнай сілаю. Яны зноў наліліся, запунсавелі...

Шпулькі запляскалі ў далоні, а хатні скразнячок здзьмуў пылінкі з палінялай кашулі дыванка. Той з палёгкай ўздыхнуў, расправіў дагэтуль пахілыя плечы і ўжо ніколі не лічыў сябе непатрэбным. Так і вісіць – ахоўнік дабрабыту бабуліных дзетак, унукаў, праўнукаў...

# Мастакі:

Вокладка: Шчэцька Мілана, 13 год (ДУА "Сярэдняя школа №3" г. Стоўбцы).

Фарзац: Каленік Ганна, 19 год, выпускніца аддзялення жывапісу ДУА "Гімназія-каледж імя І.В.Ахрэмчыка", педагог дадатковай адукацыі ДУДА "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Мінскага раёна".

Старонка 11 – "Спадчына ад гаспадыні печы": Ржэвуцкая Кацярына, 11 год (ДУА "Каўбчанскі ВПК "Дзіцячы сад-сярэдняя школа" Клічаўскага р-на).

Старонка 13 – "Спадчына ад гаспадыні печы": Забалоцкая Софья, 8 год (ДУА "Максімавіцкі ВПК "Дзіцячы сад-сярэдняя школа" Клічаўскага р-на).

Старонка 19 – "Спадчына ад гаспадыні печы": Забалоцкая Софья, 8 год (ДУА "Максімавіцкі ВПК "Дзіцячы сад-сярэдняя школа" Клічаўскага р-на).

Старонка 22 – Шпулька першая "А": Мачэкіна Алёна, педагог-арганізатор ДУА "Сярэдняя школа №2" г. Клічава.

Старонка 32 – Шпулька другая "Бабуліны зорачкі": Харытоненка Ангеліна, 15 год (ДУА "Сярэдняя школа №1 імя Героя Савецкага Саюза П.А.Крываноса", г. Клічаў).

Старонка 35 – Шпулька другая “Бабуліны зорачкі”: Ткачова Маша (19 год), выпускніца ДУА “Гімназія-каледж імя І.В.Ахрэмчыка” (жывапіс); студэнтка факультэта эстэтычнай адукацыі БДПУ імя М.Танка.

Старонка 39 – Шпулька трэцяя “Цытрынавы гарошак”: Солтан Ганна, 14 год, навучэнка аб’яднання па інтарэсах “Вясёлы пэндзлік” (ДУДА “Клічаўскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”).

Старонка 40 – Шпулька трэцяя “Цытрынавы гарошак”:  Солтан Ганна, 14 год, навучэнка аб’яднання па інтарэсах “Вясёлы пэндзлік” (ДУДА “Клічаўскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”.

Старонка 44 – Шпулька чацвёртая “Махлярка-модніца”: Пархуцкая Аксана, 12 год (ДУА “Бацэвіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 46 – Шпулька чацвёртая “Махлярка-модніца”: аўтар Каленік Таццяна (г. Мінск).

Старонка 49 – Шпулька пятая “Нечаканая ўзнагарода”: Лазько Анастасія, 11 год (ДУА “Дзімтраўскі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 52 – Шпулька шостая “Слова з кішэні”: Кушнер Паліна, 8 год (ДУА “Запольская сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 54 – Шпулька шостая “Слова з кішэні”: Кушнер Паліна, 8 год (ДУА “Запольская сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 60 – Шпулька сёмая “Паганіні”: Ільінчык Елізавета, 11 год (ДУА “Пярэкальская сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 65 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Муравіцкі Матвей, 7 год (ДУА “Максімавіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 66 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Дзюндзева Вера, 10 год (ДУА “Максімавіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 68– Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Карнейчык Вікторыя, 7 год (ДУА “Максімавіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 70 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Цішкова Ганна, 8 год (ДУА “Максімавіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 73 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Ржэвуцкая Кацярына, 11 год (ДУА “Каўбчанскі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 74 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Карнейчык Данііл, 8 год (ДУА “Максімавіцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 76 – Шпулька восьмая “Пунсовая гісторыя”: Кудлоўская Анастасія, 15 год (ДУА “Каўбчанскі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 80 – Шпулька дзявятая “Язэпава маляванка”: Канапацкая Жанна Міхайлаўна, педагог дадатковай адукацыі, краўнік аб’яднання па інтарэсах “Вясёлы пэндзлік” (ДУДА “Клічаўскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі”).

Старонка 82 – Шпулька дзявятая “Язэпава маляванка”: Мухін Дзмітрый, 8 год (ДУА “Несяцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на).

Старонка 84 – Шпулька дзявятая “Язэпава маляванка” : Мухін Дзмітрый, 8 год (ДУА “Несяцкі ВПК “Дзіцячы сад-сярэдняя школа” Клічаўскага р-на)

## ЗМЕСТ


“Адкуль мы ўсе родам? – З дзяцінства...” 3

Дзівацтвы Закона Прыцягнення 5

Бабуліны шпулькі.
**Спадчына ад гаспадыні-Печы** 10

Шпулька першая.
**"А"** 22

Шпулька другая.
**Бабуліны зорачкі** 30

Шпулька трэцяя.
**Цытрынавы гарошак** 36

Шпулька чацвёртая.
**Махлярка-модніца і яе незабыўны ўрок** 42

Шпулька пятая.
**Нечаканая ўзнагарода** 48

Шпулька шостая.
**Слова з кішэні** 51

Шпулька сёмая.
**Паганіні** 57

Шпулька восьмая.
**Пунсовая гісторыя** 64

Шпулька дзявятая.
**Язэпава маляванка** 78

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Таццяна Каленік

# Бабуліны шпулькі

## Цікавыя гісторыі для ўсёй сям'і

Рэдактары:
У.А. Арлоў, С.А. Быкава, Т. М. Якаўлевіч

Падпісана да друку 20.01.2020.
Фармат 60х84/16. Папера афсетная.
Друк лічбавы. Гарнітура: «Oksana»
Ум. друк. арк. 41,85. Ул.-выд. арк. 4,09.
Заказ № 19/476. Наклад 99 ас.

Выдавец: ТАА "Друкарскі Дом "Вішнёўка"
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца друкаваных выданняў № 1/330 ад 20.05.2014 г.

Паліграфічнае выкананне: ТАА "Друкарскі Дом "Вішнёўка".
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі вытворцы друкаваных выданняў № 2/130 ад 2.05.2014 г.
Вул. Лясная, 3, цокальны паверх, к.2, 223044, Мінскі раён, аг. Вішнёўка, Рэспубліка Беларусь.



Мяне завуць Каленік Таццяна Рыгораўна.

Нарадзілася я ў 1965 годзе ў горадзе Беразіно Мінскай вобласці. Школьныя канікулы праводзіла ў вёсцы, дзе мяне чакалі верныя сябры: дзядулявы медалі; ветрык, які жыў за аконнай ліштвою; берагіня-печ, і казачны цягнічок. Ён складаўся з парожніх драўляных шпулек, на якія бабуля чапляла квяцістую, як летняя паляна, шырму. Вясёлай кампаніяй мы займалі месцы ва ўтульных купэ, і фантазійны лакаматыў выносіў нас у свет прыгод. Кожны вагон (шпулька) меў свой колер, асаблівы, яшчэ неспазнаны намі прысмак вагоннай гарбаты, а таксама ўласную гісторыю.

Ішлі гады. Усё тужэй зацягваўся гарсэт урбанізацыі. Усё мацней дзьмула яна знішчальным подыхам на плямачкі маленькіх паселішчаў. Пастулова выцяснялася з памяці і хроніка тых падзей, але ж, як хацелася пракаціць у нашым чароўным цягніку летуценніц-дачушак!

Нібы стомлены ветразь, які забыўся ў моры здзічэлых траў, які зацята супраціўляўся бегу дажджоў і аблокаў, на нас пазірала з пустэчы знямелага дворышча... печ. Я бегла ў абдымкі пашарэлай постаці, адзінай, што ўсё яшчэ чакала, і папракала сябе ў здрадзе!..

Сюрпрыз усё ж чакаў. З нетраў печкавай таямнічасці ўсміхнуліся знаёмыя вочкі ветрыка-сябра. "На, вось, казкі нашы напішаш", – пачуўся ціхі шэпт, і нябачныя ручкі працягнулі мне ўсё, што засталося ад вёскі, хаты, дзяцінства – шпулькавы цягнічок. Яго падарожныя гісторыі я рада прадставіць вашай увазе.

ISBN 978-985-90525-2-1